Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

23 СНЕЖНЯ 2016 г. ПЯТНІЦА № 248 (28358)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



На службе дабрыні — кніга

СТАР. 2



Калядкі блізка — каўбаскі нізка

СТАР. 5



Праграма тэлебачання на тыдзень

20 КАНАЛАЎ

ЦЫТАТА ДНЯ



**Леанід МАЛЬЦАЎ, старшыня Дзяржаўнага пагранічнага камітэта:**

*«Эфектыўная сістэма падрыхтоўкі кадраў для праваахоўных органаў з'яўляецца важным элементам гарантавання нацыянальнай бяспекі. І гэтая сістэма павінна не толькі рыхтаваць прафесіяналаў сваёй справы, але і фарміраваць сапраўдных патрыётаў сваёй радзімы. Толькі ў гэтым выпадку мы можам быць упэўнены, што ў крытычнай сітуацыі, у складаных для краіны ўмовах гэтыя людзі не адступяць, а працягнуць выконваць пастаўленыя задачы».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 23.12.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9496 | ▼ |
| Еўра | 2,0356 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0320 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0742 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# Зялёна-пушысты кірмаш



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Учора ў сталіцы пачалі працаваць ёлачныя кірмашы. Адзін з іх размясціўся каля ўніверсама «Рыга». Сюды зялёны тавар пастаўляе гадавальнік Слуцкага лясгаса. Ужо трэці год прадае навагодніх прыгажунь Кацярына ЛОЖАЧНІК (на здымку справа). Кацярына кажа: «Звычайна перад святам мы прадаём па 30—40 штук ялінак у дзень. Многія жыхары гэтага раёна ўстанаўліваюць навагодні сімвал яшчэ да каталіцкіх Каляд», — расказвае яна. Напрыклад, Анастасія ЕРАШЭНКА *(на здымку злева)* выбрала самую прыгожую ёлку ўжо ўчора.

■ Мінус чатыры нулі

## КАНЧАТКОВАЕ РАЗВІТАННЕ

**Усё. Першы этап самай буйной дэнамінацыі нацыянальнай грашовай адзінкі заканчваецца. З першых дзён наступнага года пачынаецца жыццё выключна папяровых банкнот і манет узору 2009 года. З усіх цэннікаў, тарыфаў і жыровак назаўжды знікнуць «доўгія» лічбы, і мы канчаткова развітаемся з чатырма нулямі. Крыху сумна, што мы ўжо не мільянеры, але затое цяпер у нас з'явіліся манеты. Паспрабуем разгледзець станоўчыя і адмоўныя бакі дэнамінацыі з пункту гледжання эканамічнай тэорыі, а таксама зыходзячы з практыкі, уласнай і не толькі...**

### Эканамічны эфект дзяржавы

Яшчэ да пачатку дэнамінацыі спецыялісты Нацбанка аб'явілі насельніцтву, што ва ўсім свеце эканамічнымі агентамі найбольш пазітыўна ўспрымаецца тая грашовая адзінка, дзе прысутнічае найменшая колькасць нулёў. Сапраўды, выключна тэхнічная дэнамінацыя нацыянальнай валюты нясе для дзяржавы прыкметны станоўчы эфект. Па-першае, гэта памяншае выдаткі на выраб грошай, таксама азначае сабой заканчэнне перыяду нерэгуляванай інфляцыі, спрашчае разлікі, а таксама зніжае фізічны аб'ём грашовай масы, што ўскосна ўмацоўвае грашовую адзінку. Ці сапраўды гэта так?

Паводле інфармацыі Нацбанка, да 1 ліпеня 2016-га ў абароце было прыкладна каля 600 млн грашовых знакаў узору 2000 года. Для іх замены патрабавалася ўсяго 80 млн банкнот новага намінальнага ўзору і 400 млн манет. Гэта азначае, што значна скараціліся выдаткі на транспарціроўку, пералік, захоўванне, дастаўку грошай да спажыўца. Увядзенне манеты — добра гэта ці дрэнна? «Тэрмін службы манеты складае ад 10 да 15 гадоў, а тэрмін службы разменнай банкноты дробнага наміналу — ад 6 да 12 месяцаў, і гэта ў лепшым выпадку», — адзначаюць спецыялісты.

СТАР. 4

■ Падары дзіцяці свята!

## ЛЮДЗІ З СЭРЦАМ

Хто мае ўласных дзяцей, хутчэй пашкадуе чужых



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**«Дзякуй вам, што нагадалі нам, каму трэба дапамагчы адчуць надыход свята». Такімі словамі ўчора дзякавалі карэспандэнтам «Звязды» пакупнікі ГУМа, якія далучыліся да нашай дабрачыннай акцыі па зборы падарункаў для выхаванцаў сталічнага дзіцячага дома №5. У сваю чаргу, паўдня правёўшы ў дзіцячым аддзеле ўнівермага, скажу: яшчэ раз пераканалася ў тым, што нашы жанчыны — сапраўдныя і чуллівыя, здольныя суперажываць чалавечым патрэбам і рабіць добрыя справы. Чаму я так упэўнена ў гэтым? Таму што большасць з тых, хто набыў у краме гасцінец і пакінуў яго ў скрыні з падарункамі, гэта людзі, якія, здаецца, самі маюць патрэбу ў клопаце, — шматдзетныя сем'і і пенсіянеры.**

СТАР. 3

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА,
5 разоў на тыдзень!
Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2017 года!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# ДРУГОЕ КАЛЬЦО СТАЛІЦЫ

**Учора Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка ў час рабочай паездкі ў Мінскую вобласць прыняў удзел у цырымоніі адкрыцця другой кальцавой аўтамабільнай дарогі вакол Мінска.**

Кіраўніку дзяржавы далажылі аб выкананні яго даручэнняў па будаўніцтве МКАД-2, рэканструкцыі трасы на ўчастку Астрашыцкі Гарадок — Курган Славы (Р80) і перспектывах развіцця транспартнай інфраструктуры Беларусі.

Знаёмячыся з праведзенай работай, Прэзідэнт адзначыў, што апошнім часам вялікая ўвага ўдзяляецца будаўніцтву буйных магістраляў, але нельга забываць і пра дарогі мясцовага значэння. «У найбліжэйшыя месяцы мы збяромся, абмяркуем і прымем рашэнне, як будзем іх аднаўляць. Кожны аграгарадок (а іх каля дзвюх тысяч) павінен быць злучаны з раённым цэнтрам. Ад раённых цэнтраў да абласных у нас больш-менш нядрэнныя дарогі, але іх таксама дзе-ніндзе трэба прыводзіць у парадак», — сказаў Прэзідэнт.

Разглядаецца варыянт, што грашовыя сродкі для рамонту дарог дадасць адзін з банкаў. Вяртаць крэдыт будуць за кошт дзяржаўнай пошліны, якую плацяць грамадзяне за допуск транспартных сродкаў да ўдзелу ў дарожным руху. «Хутчэй за ўсё, мы не будзем распыляць гэтыя сродкі па раёнах. У кожнай вобласці вызначым дарогі, якія будзем аднаўляць і прыводзіць у парадак. Мы павінны губернатарам аддаць гэтыя грошы на канкрэтную дарогу пад іх вельмі строгую адказнасць, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Пакуль рашэнне не прынята, будзем разглядаць розныя варыянты. Але рашэнне прымем у найбліжэйшы час».

Абмяркоўваліся таксама перспектывы развіцця аўтадарогі Брэст — Гомель, якая стане часткай міжнароднага транспартнага маршруту Еўропа — Заходні Кітай (праект «Мерыдыян»).

Падчас рабочай паездкі Прэзідэнт пагутарыў з прадстаўнікамі працоўных калектываў дарожна-будаўнічых арганізацый-падрадчыкаў. Аляксандр Лукашэнка падзякаваў ім за праведзеную работу і адзначыў, што траса атрымалася прыгожай і надзейнай.

Што датычыцца дарожна-будаўнічых работ на гродзенскім напрамку, якія фінансуе Сусветны банк, кіраўнік дзяржавы адзначыў, што гэты праект выгадны для Беларусі. «Для мяне было важна захаваць працоўныя калектывы і каб нашы будаўнічыя трэсты атрымалі работу за гэтыя еўрапейскія або сусветныя грошы. Малайцы, выйгралі конкурс. Але, калі б мы не пабудавалі гэтую дарогу, мы б не мелі гэтага падраду. А зараз мы і заказчыкі, і падрадчыкі, таму што ў нас ёсць вопыт у будаўніцтве. На ўзроўні Сусветнага банка прызналі, што мы будуем дарогу ў два-тры разы танней, чым нашы суседзі», — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка.

У час размовы Прэзідэнта з прадстаўнікамі працоўных калектываў прагучала меркаванне, што да будаўніцтва другой узлётна-пасадачнай паласы ў Нацыянальным аэрапорце «Мінск» неабходна падключыць беларускіх будаўнікоў. Кіраўнік дзяржавы падтрымаў гэтую ідэю і выказаў упэўненасць, што айчынныя арганізацыі справяцца з гэтай работай сваімі сіламі, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта.

Потым Прэзідэнт праехаў па ўчастку трасы на сучаснай мадэлі гарадскога аўтобуса вытворчасці МАЗ, азнаёміўся з тэхнічнымі характарыстыкамі і ўладкаваннем другой Мінскай кальцавой аўтамабільнай дарогі. Кіраўніка дзяржавы праінфармавалі аб размяшчэнні інвестыцыйных участкаў і аб'ектаў прыдарожнага сэрвісу ўздоўж другой кальцавой аўтадарогі.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў асаблівую ўвагу на развіццё і добраўпарадкаванне прылеглых тэрыторый. Паводле яго слоў, аб'екты, якія будуюцца, павінны адпавядаць статусу аўтадарог міжнароднага значэння.

## ■ Наша пазіцыя

# ЗА СВАЕ СЛОВЫ ТРЭБА АДКАЗВАЦЬ

**Учора ў Міністэрства замежных спраў быў выкліканы саветнік-пасланнік Пасольства Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь Вадзім ГУСЕЎ.**

Як паведаміла прэс-служба знешнепалітычнага ведамства, падчас сустрэчы ў МЗС расійскаму дыпламату «быў заяўлены пратэст у сувязі з растыражаванымі СМІ выказваннямі дырэктара Федэральнай дзяржаўнай навуковай бюджэтнай установы «Расійскі інстытут стратэгічных даследаванняў» Рашэтнікава Л.П. у адрас Рэспублікі Беларусь».

«Беларускім бокам была дадзена прынцыповая ацэнка ў дачыненні да неабгрунтаванасці па сутнасці і катэгарычнай непрымальнасці па форме падобных заяў, — гаворыцца ў прэс-паведамленні. — Падкрэслена, што яны абсалютна не адпавядаюць стратэгічнаму характару беларуска-расійскіх адносін, а таксама зафіксаваным у двух- і шматбаковых дакументах прынцыпам, на якіх грунтуецца супрацоўніцтва нашых брацкіх дзяржаў, — павагі суверэнітэту, незалежнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці».

Напярэдадні па сецiве «разляцелася» выказванне вышэйназванага Леаніда Рашэтнікава пра тое, што беларускай мове, маўляў, усяго толькі 90 гадоў. Гэта ўскалыхнула нашу інтэлігенцыю і стала штуршком для сапраўднай «хвалі» публікацый пра старажытнасць нашай мовы і пра тое, што карані беларускай нацыі паходзяць яшчэ з пазамінулага тысячагоддзя — з часоў, калі ў рэгіёне найважнейшую ролю адыгрывалі Полацкае і Тураўскае княствы.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

■

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне старшыні праўлення Беларускага рэспубліканскага саюза спажывецкіх таварыстваў, намесніку старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання Іванову Валерыю Мікалаевічу ў сувязі з вялікім горам, якое яго напаткала, — смерцю МАЦІ.**



## ■ Парламенцкі дзённік

# УЗАЕМАДЗЕЯННЕ НАЛАДЖАНА ВЫДАТНАЕ

**Падрыхтоўка да летняй сесіі Парламенцкай асамблеі АБСЕ ў Мінску ўжо ідзе**

**Арганізацыя па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (АБСЕ) і наша краіна наладзілі выдатнае ўзаемадзеянне па шэрагу напрамкаў. Такое меркаванне выказаў спецыяльны каардынатар місіі кароткатэрміновых наглядальнікаў АБСЕ на выбарах у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі, намеснік старшыні Парламенцкай асамблеі АБСЕ Кент ХАРСТЭД на сустрэчы з беларускімі парламентарыямі ў Мінску.**

Падчас сустрэчы размова галоўным чынам ішла аб справаздачы, якую АБСЕ прадставіла па выніках парламенцкіх выбараў у Беларусі, і змешчаных у ёй рэкамендацыях. У той жа час Кент Харстэд адзначыў «выдатнае ўзаемадзеянне з Беларуссю па іншых напрамках, акрамя выбарчага пытання». Адзін з такіх праектаў датычыцца беларускага парламента, асабліва ў тым, што мае дачыненне да супрацоўніцтва з жанчынамі-парламентарыямі.

Вяртаючыся да тэмы выбараў і магчымай карэкціроўкі выбарчага заканадаўства, Кент Харстэд сказаў, што АБСЕ гатова прапанаваць Беларусі свой экспертны досвед. Бакі абмяняліся поглядамі на дзейнасць АБСЕ ў частцы ўдасканалення выбарчага заканадаўства. Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Леанід ЦУПРЫК адказаў на шэраг пытанняў дэлегацый ПА і БДІПЧ АБСЕ.

Акрамя выбарчых пытанняў парламентарыі і прадстаўнік АБСЕ абмеркавалі правядзенне летняй сесіі Парламенцкай асамблеі гэтай арганізацыі, якая пройдзе ў нашай сталіцы.

Кент Харстэд адзначыў, што правядзенне ў Мінску такога сур'ёзнага мерапрыемства, як сесія ПА АБСЕ, служыць добрай магчымасцю для ўзаемадзеяння, абмену досведам, ідэямі па розных пытаннях. У сувязі з гэтым ён прапанаваў беларускаму парламенту арганізаваць на палях сесіі круглыя сталы, семінары і іншыя мерапрыемствы з удзелам дэлегатаў сесіі. Леанід Цупрык адзначыў, што менавіта такім чынам прымаючы бок і плануе паступіць.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

# РАЗМОВА НА РОЎНЫХ

**Міхаіл Мяснікові́ч прапанаваў моладзі выказаць ідэі для IV Форуму рэгіёнаў**

**Члены маладзёжнай палаты трэцяга склікання пры Лёзненскім раённым Савеце дэпутатаў наведалі Савет Рэспублікі, дзе маладыя парламентарыі сустрэліся са старшынёй Савета Рэспублікі Міхаілам МЯСНІКОВІЧАМ і старшынёй Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Аляксандрам ПАПКОВЫМ.**

Міхаіл Уладзіміравіч на сустрэчы ў зале пасяджэнняў гаварыў пра неабходнасць захавання сямейных каштоўнасцяў і веданне гісторыі. Таксама старшыня Савета Рэспублікі адзначыў, што Расія вельмі шмат робіць па развіцці маладзёжнага парламентарызму як аднаго з важных кірункаў маладзёжнай палітыкі. «Трэба наш БСРМ уключыць у падрыхтоўку і правядзенне IV Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі», — сказаў ён.

Аляксандр Папкоў больш падрабязна расказаў пра работу Саветаў дэпутатаў розных узроўняў і ўдзяліў увагу таму, што «ў адпаведнасці з Канстытуцыяй для мясцовых Саветаў галоўнае — разгляд планаў сацыяльна-эканамічнага развіцця і бюджэт. Калі яны ўпускаюць гэты момант — гэта няправільна. Менавіта Савет павінен разглядаць і кантраляваць, як выконваецца праграма развіцця, ці ўлічаны стратэгічныя напрамкі, важныя для рэгіёна. Мы павінны пастаянна рабіць замеры, як насельніцтва ставіцца да ўлады. На жаль, многія на месцах не ведаюць сваіх дэпутатаў. Чаму? Таму што і нашы дэпутаты, на жаль, неактыўна працуюць на месцах. Свайго дэпутата трэба ведаць не толькі ў твар, але і па яго справах».

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*

■

## ■ Дабрачыннасць

# НА СЛУЖБЕ ДАБРЫНІ — КНІГА

**Падчас святочнага дабрачыннага аўкцыёну сабрана 8,6 тысячы рублёў**

**Сёлета гэтыя сродкі будуць накіраваныя ў Шклоўскую школу-інтэрнат для дзяцей з парушэннямі зроку.**

Кнігі здольныя ствараць цуды. Гэта чарговы раз даказалі Калядны дабрачынны баль кнігі і святочны аўкцыён, якія ўжо пяты раз прайшлі ў сталіцы і былі арганізаваныя Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Свята стала яркай зоркай, далучанай да рэспубліканскай акцыі «Нашы дзеці», што праходзіць пад патранатам Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі. Месцам сустрэчы аматараў кнігі, выдаўцоў, кнігагандляроў, дзяржаўных дзеячаў, спартсменаў і музыкантаў па добрай традыцыі быў абраны Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь. Тут гучала музыка, у залах і калідорах можна было сустрэць элегантных дам і галантных кавалераў, панаў, якія і на гэтым сцэнкамі з жыцця ў пачатку XX стагоддзя, пазнаёміцца з Францыскам Скарынам і нават атрымаць у падарунак тэкст рамансa «Зорка Венера» ад самога Максіма Багдановіча, дакладней, яго «двайніка»- акцёра.



### Топ-3 самых дарагіх лотаў кніжнага аўкцыёну

1. З малатка за 1500 рублёў пайшла ўнікальная кніга «Беларусь алімпійская», што пабачыла свет у выдавецтве «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» да 25-годдзя алімпійскага руху ў Беларусі. Яе адметнасць — у арыгінальных фотаздымках, зробленых беларускімі фотакарэспандэнтамі падчас Алімпійскіх гульняў. На гэтым асобніку пакінулі аўтографы нашы спартсмены — прызёры Алімпійскіх гульняў.

2. За 1200 рублёў прададзена шасцітомная энцыклапедыя «Культура Беларусі» — унікальны праект выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі».

3. 1000 рублёў не пашкадавалі адзін з удзельнікаў аўкцыёну за «Падарожжа нашчадка цэсарэвіча» з тэматычнай групы «Кнігі краін Садружнасці». Гэтае выданне не толькі знаёміць з гістарычнымі фактамі, але і змяшчае сапраўды ўнікальныя ілюстрацыі.



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА

— Кніга суправаджае чалавека па жыцці. Разам з кнігамі мы сталеем, расцём, — падкрэсліла ў сваім выступленні **міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ.** — Вельмі знакава, што сёлета на аўкцыёне прадстаўлены сапраўды важныя для Беларусі кнігі. Яны расказваюць пра нашы алімпійскія дасягненні, культуру, выдатных пісьменнікаў. Упэўнена, наш баль прыняcе многа радасці выхаванцам Шклоўскай школы-інтэрната. Але для нас свята — гэта яшчэ і калядная справаздача перад чытачом і масток у будучыню. Хочам паказаць сапраўды знакавыя кніжныя праекты, рэалізаваныя сёлета, у Год культуры. Варта ведаць, што мы застаёмся нацыяй, якая чытае. Дзякуючы дзяржаўнай падтрымцы рэалізуем многа сацыяльна значных праектаў. Мы не страцілі кнігу і сёння рыхтуемся да знакавых дат наступнага года — 500-годдзя беларускага кнігадрукавання, юбілеяў нашых пісьменнікаў-класікаў. Але вельмі хацелася б, каб кніга была частым госцем эфіраў на радыё і тэлебачанні.

З кожным годам кола зацікаўленых гасцей і ўдзельнікаў балю пашыраецца. Вось і сёлета да свята дабрачыннасці і кнігі далучыліся прадстаўнікі розных структур і сфер дзейнасці. Так, начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Магілёўскага аблвыканкама Андрэй Кунцэвіч прадставіў лот — выданне «Спірыдон Собаль і вытокі магілёўскага кнігадруку», дырэктар «Віцебскаблсаюздруку» Людміла Гайдук прачытала ўрывак з рамана Івана Шамякіна «Вазьму твой боль», саветнік Нацыянальнага алімпійскага камітэта Беларусі Анастасія Марыніна і алімпійскі чэмпіён Аляксандр Багдановіч расказалі пра ўнікальны праект «Беларусь алімпійская», а дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура», паэт Алесь Бадак звярнуўся да памяці пра сёлетняга юбіляра Уладзіміра Мулявіна.

Падчас аўкцыёну было прадстаўлена 17 кніжных праектаў, аб'яднаных значнымі тэмамі Года культуры. Безумоўна, не засталіся без увагі 500-годдзе беларускага кнігадрукавання, юбілеі нашых класікаў Максіма Багдановіча, Івана Шамякіна, памятныя даты прыгожых муз і знакавых асоб культуры — Уладзіславы Луцэвіч, жонкі Янкі Купалы і стваральніцы музея паэта, а таксама вядомай актрысы, народнай артысткі Беларусі Марыі Захарэвіч. Пад вокладкамі кніжных лотаў змясціліся таксама апавяданні пра краіну, знакавыя творы для дзяцей. Значнымі сталі выданні краін Садружнасці, прапанаваныя партнёрамі і даўнімі сябрамі Беларусі. Дарэчы, у гэтай тэматычнай катэгорыі прадставілі сапраўды ўнікальныя кніжныя праекты — раман-трылогію Ільяса Есенберліна «Качэўнікі» выставіла на аўкцыён Асацыяцыя выдаўцоў, паліграфістаў і кнігараспаўсюджвальнікаў Казахстана, а шыкоўна аздобленае «Падарожжа нашчадка цэсарэвіча» прапанавала Федэральнае агенцтва па друку і масавых камунікацыях Расійскай Федэрацыі.

**Марына ВЕСЯЛУХА.** *vesialuha@zviazda.by*

■

■ Разам

# ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЯ ЭЛІТА АБ'ЯДНОЎВАЕЦЦА

**Беларускі прафсаюз работнікаў Нацыянальнай акадэміі навук далучыўся да Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі. Рашэнне аб іх аб'яднанні было прынята на IX з'ездзе Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі.**

— Гэта добра абдуманы крок, — лічыць **старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Міхаіл ОРДА.** — Летась я прысутнічаў на многіх справаздачна-выбарных з'ездах, дзе неадноўчы гучалі прапановы аб аб'яднанні. Людзі хочуць бачыць за сабой моцны прафсаюз, які забяспечыць больш шырокія магчымасці па абароне іх правоў. Менавіта таму ў маі мінулага года на VII з'ездзе Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі было прынята прынцыповае рашэнне — для павышэння эфектыўнасці працы трэба аб'ядноўваць шэраг роднасных прафсаюзаў, што, безумоўна, дапаможа зрабіць нашу структуру больш кампактнай і больш эфектыўнай.

Міхаіл Орда адзначыў, што падобныя працэсы зараз праходзяць у многіх краінах свету. «Прафсаюзы аб'ядноўваюцца, каб мець больш моцны голас у перамовах з наймальнікам і дабівацца лепшых гарантый для сваіх работнікаў. Таму мы таксама не можам заставацца ўбаку ад гэтых працэсаў, не можам распыляць свае рэсурсы. Напрыклад, у Германіі з яе развітой прамысловасцю дзейнічае 11 галіновых прафсаюзаў. Столькі ж налічваецца прафсаюзаў і ў Кітаі. Для параўнання: у Беларусі на пачатак года функцыянавалі 28 галіновых прафсаюзаў. На сённяшні дзень іх колькасць зменшылася да 22-х...»

— Прафсаюзы работнікаў НАН і работнікаў адукацыі і навукі — два абсалютна ўнікальныя аб'яднанні. Гэта інтэлектуальная эліта грамадства. Аб'яднаўшы іх, мы тым самым аб'яднаем і лепшы досвед, і лепшыя напрацоўкі ў сферы абароны інтарэсаў педагогаў і навукоўцаў, — падкрэсліў Міхаіл Орда. — Таму гэта рашэнне — абсалютна лагічнае: адукацыя не можа быць адарванай ад навукі, а навука павінна цесна ўзаемадзейнічаць з адукацыяй. Адзіны прафсаюз будзе працаваць на збліжэнне і вырашэнне важных для галіны задач, спрыяць наладжванню цесных прафесійных сувязяў паміж усімі ўстановамі адукацыі і навукі.

Аб'яднальныя працэсы ўжо прайшлі ў сферы прамысловасці, транспарту, энергетыкі, водных рэсурсаў і геатэхналогій. Міхаіл Орда запэўніў, што Федэрацыя прафсаюзаў вітае гэту тэндэнцыю і будзе рабіць усё, каб прафсаюзны рух у нашай краіне станавіўся больш моцным і аўтарытэтным.

**Старшыня Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Аляксандр БОЙКА** таксама лічыць вяртанне прафсаюза НАН у прафсаюз работнікаў адукацыі і навукі гістарычна заканамерным. «Упэўнены, што прынятае сёння рашэнне ўзмоцніць пазіцыі нашага адзінага прафсаюза і аўтарытэт педагагічнай і навуковай грамадскасці», — дадаў ён.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

■ Надвор'е

# ЦЁПЛА НЕ ПА СЕЗОНЕ

## На наступным тыдні сіноптыкі абяцаюць да плюс 7 градусаў

**Да канца тыдня ў краіне захаваецца даволі цёплае для снежня надвор'е, паведамляе галоўны сіноптык Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Святлана РЫБАКОВА.**

Сёння на тэрыторыю Беларусі завітае атмасферны фронт, які перамяшчаецца з боку Заходняй Еўропы, таму на большай частцы краіны пройдзе снег і мокры снег. У асобных раёнах захаваецца слабы туман і галалёд, на дарогах — галалёдзіца. Максімальная тэмпература паветра будзе ад мінус 2 да плюс 3 градусаў. У суботу чарговая паласа атмасферных франтоў прынясе нам кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Паўсюдна слабы галалёд. Тэмпература паветра ўначы будзе ад нуля да мінус 6 градусаў, удзень — ад мінус 1 да 4 цяпла. Захаваецца няўстойлівае надвор'е і ў нядзелю. Амаль паўсюдна будзе ісці невялікі мокры снег і дождж. У асобных раёнах магчымы слабы галалёд. Тэмпература паветра ўначы складзе ад 5 марозу да 1 цяпла, а ўдзень будзе ад мінус 1 да плюс 4 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, на старце наступнага тыдня чакаецца ветранае і сырое надвор'е. Аднак стане яшчэ цяплей. У панядзелак на большай частцы тэрыторыі краіны пройдзе невялікі дождж (часам мокры снег), уначы па ўсходзе чакаецца слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Увага! Удзень у асобных раёнах прагназуецца моцны парывісты вецер. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 1 да плюс 4 градусаў, а ўдзень увогуле будзе 1—7 цяпла. Праўда, потым да нас завітае сур'ёзны цыклон з цэнтрам над паўночным захадам еўрапейскай тэрыторыі Расіі, і надвор'е сапсуецца. Прагназуецца, што ў аўторак і сераду паўсюдна па краіне будуць ісці кароткачасовыя ападкі (мокры снег, дождж). У асобных раёнах магчымы слабы галалёд. На ўсёй тэрыторыі краіны чакаецца моцны парывісты вецер. Тэмпература паветра ў аўторак на працягу сутак складзе ад 2 марозу да 4 цяпла, а ў сераду стане на некалькі градусаў халадней.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Сталічны час

# Платны ўезд у горад, новыя спартыўныя збудаванні і ўдалая рэформа ЖКГ

## Старшыня Мінгарвыканкама расказаў, як зменіцца сталіца, і абверг «гарадскія» чуткі



**Напярэдадні Новага года Андрэй ШОРАЦ абмеркаваў з журналістамі набалелыя для жыхароў сталіцы пытанні. Напрыклад, пра тое, што ж будзе з даўгабудамі, якія ўжо некалькі гадоў мазоляць мінчанам вочы. Зараз вядуцца перагаворы з патэнцыйнымі інвестарамі наконт завяршэння аздобных работ у будынку каля цырка. Лёс тралейбуснага дэпо ў цэнтры стане вядомы толькі ў другім квартале наступнага года, на працягу 2017 года павінен з'явіцца і генеральны план пераўтварэння ўжо прададзенай тэрыторыі былога Чэрвеньскага рынку. Што датычыцца чутак пра «замарозку» будаўніцтва бізнес-цэнтра «Белгазпрамбанка», то яны няпраўдзівыя.**

На месцы 2-й гарадской бальніцы ў хуткім часе пачнецца ўзвядзенне шматфункцыянальнага комплексу, у складзе якога будзе гасцініца, дзелавы цэнтр, рэстаранная і крамная зоны. Не ацалее і павільён выставачнага комплексу «Белэкспа» па вуліцы Янкі Купалы — яго таксама знясуць. Рэалізацыяй праекта зоймецца кампанія з ААЭ, якая ўжо была прадстаўлена ў Беларусі. Рашэнне па забудове пляцоўкі былога музея гісторыі ВАВ пакуль не прынята, а вось драўляная замчышча каля Нямігі дакладна не будзе.

Да другіх Еўрапейскіх гульняў у 2019 годзе ў Мінску пабудуюць цэнтр мастацкай гімнастыкі, рэканструяваны стадыён «Дынама» будзе ўведзены ў эксплуатацыю ўжо да канца наступнага года. На 2017 год запланаваны пачатак рамонту аднаго з найстарэйшых кінатэатраў горада — «Перамогі», кінатэатр «Авангард» у Грушаўцы будаваць не будуць.

Вострым пытаннем застаецца транспартная нагрузка на цэнтр сталіцы. Для вырашэння гэтай праблемы, мабыць, усё ж такі будзе зацверджаны платны ўезд у горад і выдзелены асобныя палосы для грамадскага транспарту. На ўчастку ад Кастрычніцкай плошчы да Белдзяржцырка новаўвядзенне ўжо ўжылі, спецыяльнае абсталяванне дапаможа ацаніць яго эфектыўнасць. Рух на аўтамабілі ў цэнтры павінен стаць меней зручным, чым на грамадскім транспарце.

Мэр горада высока ацаніў вынікі рэформы сістэмы сталічнай ЖКГ. У гэтым годзе была створана адзіная дыспетчарская служба, якая працуе кругласутачна. Удалося аптымізаваць і работу жыллёва-эксплуатацыйных службаў. Палепшыць якасць абслугоўвання атрымалася праз падзел функцый заказчыкаў і падрадчыкаў, а таксама ўкараненне тэндарнай сістэмы пры правядзенні капітальнага рамонту.

Андрэй Шорац прызнаў, што на цяперашні момант існуюць сур'ёзныя праблемы ў развіцці рынку арэнднага жылля. У тым ліку з яго аплатай, а таксама высяленнем жыхароў-неплацельшчыкаў. Тым не менш, нягледзячы на праблемы з фінансаваннем, сёлета былі пабудаваны два арэндныя дамы. Яшчэ па адным увядуць у эксплуатацыю ў 2017 і 2018 гадах.

У надыходзячым годзе сталіца маштабным святам адзначыць сваё 950-годдзе. Падрыхтоўка да падзеі ўжо пачалася: створаны аргкамітэт, які займаецца складаннем плана культурна-масавых мерапрыемстваў. Ужо дакладна вядома, што ў гонар юбілею ў сталіцы будзе праведзены цыркавы фестываль сусветнага ўзроўню.

**Дар'я КАСКО.** *kasko@zviazda.by*

# ЛЮДЗІ З СЭРЦАМ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Трэба адзначыць, што ўчора ў ГУМе быў дзень зніжак. Тым больш прыемна, што ў гэтай мітусні людзі заўважалі нашу скрыню, чулі нашы звароты і знаходзілі час адрэагаваць. «Шмат не атрымліваецца даць, але вельмі хочацца дапамагчы, чым можаш», — казалі многія. Хтосьці загадзя набываў падарункі для дзяцей разам са сваімі пакупкамі, хтосьці зноў вяртаўся ў доўгую чаргу і купляў гасцінец ужо спецыяльна для малых.

— Я ўвогуле рэдка хаджу па крамах, таму што займаюся ўнучкамі. Не магла не далучыцца да вашай прапановы дапамагчы іншым дзецям, бо вельмі шкадую іх усіх, — расказала Валянціна, бабуля Варвары і Сафіі.

Мама траіх дзетак Вольга з 5-гадовым Кірылам таксама не абмінулі нашу скрыню:

— Я шматдзетная маці, таму спачуваю ўсім дзецям планеты і ўсіх віншую з Новым годам, — сказала яна.

Людміла і Святлана, дзве сяброўкі, сказалі, што звяздоўцы падаравалі ім добры настрой і паклалі ў скрыню пластылін, алоўкі, маляванкі ды акварэльку:

— Хутка Новы год, усе набываюць падарункі, мы за імі таксама прыйшлі. Чаго толькі не зробіш дзеля дзяцей. А вас убачылі і захацелі, каб цуд і для дзетак з інтэрната адбыўся.

Некаторыя спачатку цікавіліся, што адбываецца, удакладнялі, што будзе больш карысным для выхаванцаў дзіцячага дома, і прыносілі, што называецца, па спісе. У большасці сваёй гэта самы расходны матэрыял: маляванкі, альбомы, фарбы, фламастары, пластылін, наборы каляровых алоўкаў.

Цэлая сям'я: хлопчыкі Фёдар і Сцяпан, тата Сяргей і мама Ірына, якая, дарэчы, чакае пятае дзіця (у сям'і яшчэ дзве старэйшыя дзяўчынкі) спецыяльна вярнуліся ў чаргу, каб пакласці ў скрыню гасцінцы.




Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

— Глядзіш на сваіх унукаў, бачыш, як яны радуюцца, і думаеш, а як жа тыя, у каго няма ні бабулі, ні мамы... Хачу пажадаць тым дзеткам здароўя, поспехаў і ўсяго самага добрага, — расказалі дзве бабулі Валянціна і Надзея, якія таксама не прамінулі нашу скрыню.

Тыя, хто зусім спяшаўся і не меў магчымасці яшчэ раз адстаяць чаргу, проста пакідалі грошы са словамі «купіце што-небудзь патрэбнае». За іх мы потым набылі для выхаванцаў дома прылады для спартыўных камандных гульняў і гелі для душа.

Неабыякавасць і душэўнасць некаторых удзельнікаў акцыі ўражвае. У імкненні зрабіць карысную справу яны абяцалі прынесці гасцінцы для дзяцей з дома.

Так, Кацярына, у якой трое дзетак і ўжо пяцёра ўнукаў, паабяцала, што абавязкова завітае да нас у рэдакцыю і прынясе вязаныя шкарпэткі. Упэўнена, гэты цёплы падарунак будзе дарэчы.

— Душа баліць за ўсіх, я заўжды дапамагаю, каму магу. Вечарамі вяжу шкарпэткі і раздаю, каму трэба, — падзялілася яна.

Мая Іванаўна, таксама мама і бабуля, не толькі пакінула гасцінец, але і паабяцала сабраць дома стужкі, ніткі і тканіну для рукадзелля, даведаўшыся, што патрэбна выхаванцам.

— Хочацца, каб у дзяцей было ўсяго пабольш, каб яны не сумавалі, каб пра іх заўжды нехта памятаў, — падзялілася яна.

Марына, Любоў, Насця, Ніна, Юля, Кацярына і многія-многія іншыя нашы сённяшнія памочнікі, якія нават не назвалі сваіх імёнаў, але не пакінулі без увагі нашу ідэю, сціпла паклаўшы падарункі і пайшоўшы далей па сваіх справах, вялікі і шчыры вам дзякуй за вашу сардэчнасць, увагу і дабрыню ад усёй нашай вялікай рэдакцыі.

За грошы, сабраныя супрацоўнікамі «Звязды», мы набылі для юных спартсменаў дома два футбольныя мячы, настольныя гульні, тавары для рукадзелля юным майстрыхам, іншыя карысныя і патрэбныя рэчы...

Аб гэтым падрабязна — на нашым сайце. А пра тое, як мы ўручалі падарункі, раскажам асобна.

**Ірына СІДАРОК.** *sidarok@zviazda.by*

■ Здарэнні

# БЕЛАРУСКА ПАЦЯРПЕЛА Ў МАСКВЕ

**Учора раніцай у расійскай сталіцы падчас рамонту вестыбюля станцыі метро «Каломенская» прагрымеў выбух. Ад інцыдэнту пацярпела сем чалавек (пераважна людзі, што знаходзіліся на прыпынку грамадскага транспарту), чатыры былі шпіталізаваны. Сярод іх апынулася 26-гадовая грамадзянка Беларусі Вераніка Кударавец, інфармацыю пра гэта пацвярджаюць у пасольстве нашай краіны ў Расіі.**

Паводле звестак прэс-службы ўстановы, дзяўчына атрымала неабходную медыцынскую дапамогу і была выпісана з клінікі. Супрацоўнікі пасольства працягваюць адсочваць сітуацыю. З ліку іншых пацярпелых як мінімум адзін знаходзіцца ў цяжкім стане. Паводле папярэдняй версіі, прычынай здарэння стала парушэнне тэхнікі бяспекі пры правядзенні зварачных работ — мяркуецца, што выбухнуў газавы балон.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*

# КАНЧАТКОВАЕ РАЗВІТАННЕ


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Старыя грошы хутка мы ўбачым толькі ў здробненым выглядзе і брыкецікáх, калі пашчасціць набыць такі сувенір ад Нацбанка.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Праўда, сама дэнамінацыя — мерапрыемства не таннае. Цаной з'яўляюцца выдаткі на вытворчасць новых грошай і замену старых, затраты на ўнясенне змяненняў у разлікі, выдаткі на пераналадку абсталявання, затраты гандлёвых і іншых арганізацый на перапісванне цэннікаў, а таксама асабістыя выдаткі грамадзян, звязаныя з прывыканнем да новых грошай. Напрыклад, як заўважылі спецыялісты Нацбанка, сабекошт выбару адной купюры і манеты вагаецца ад 1 да 4 еўрацэнтаў. Аднак агульную суму падобных выдаткаў яны так і не назвалі, бо «гэта было даўно».

Можа здацца, што ў гэтай схеме ў дэнамінацыі мінусаў больш, чым плюсаў. Аднак негатыўныя наступствы дэнамінацыі з'яўляюцца часовымі, а ранейшы ціск «лішніх нулёў» на эканоміку аказваўся велічынёй пастаяннай.

У эканаміча здаровым грамадстве абмен грашовых знакаў не аказвае прыкметнага ўплыву ні на эканоміку, ні на грамадскае жыццё. Калі, вядома, праводзіцца менавіта толькі дэнамінацыя без дадатковых працэдур (напрыклад, увядзення абмежаванняў на суму, што падлягае абмену адной асобай, прад'яўленне патрабавання дадатковай спраўздачы аб крыніцы даходу і інш.). У нас гэта таксама часткова прысутнічае, бо працягваецца барацьба з шэрымі даходамі, якія «сябруюць» менавіта з наяўнымі грашыма.

> **Да 1 ліпеня 2016-га ў абароце было прыкладна каля 600 млн грашовых знакаў узору 2000 года. Для іх замены патрабавалася ўсяго 80 млн банкнот новага намінальнага ўзору і 400 млн манет.**

## Рубель з гроша паходзіць

Працягваючы гаварыць аб праблемах, што спадарожнічаюць дэнамінацыі, незалежныя эксперты заўважаюць, што да эканамічна абгрунтаваных выдаткаў дадаецца пэўны псіхалагічны момант. Так, па назіраннях у розных краінах, было адзначана, што людзі лягчэй расстаюцца з манетамі, асабліва дробнымі, чым з купюрай на тую ж суму. Тое ж маглі заўважыць многія нашы суайчыннікі, якія выязджалі ў краіны з больш «дарагой» грашовай адзінкай. Расійскія рублі ці грыўні ў першы момант траціцца значна лягчэй, чым адпаведная сума ў тысячах беларускіх рублёў.

Менавіта з гэтай прычыны простыя грамадзяне адразу пасля дэнамінацыі лягчэй ставяцца да росту цэн. А тое, што здаецца ў першыя дні акругленнем, можа неўпрыкмет «з'есці» 15—20% даходу. Нешта падобнае ў нас у ліпені і адбывалася, але далейшае сезоннае патанненне гародніны і масавыя акцыі гандлёвых сетак прывялі да таго, што ў пачатку восені мы ўпершыню за многія гады назіралі часовую дэфляцыю. Але і ў гэтым выпадку свае грошы насельніцтва пачынае траціць больш актыўна. Атрымліваецца, што калі выдаткі грамадства абмяжоўваюцца толькі гэтым, то яны цалкам кампенсуюцца адпаведным ажыўленнем рознічнага абароту.

А вось з пасылам аб тым, што людзі сёння пачалі больш актыўна «развітвацца» з манетамі, я б паспрачаўся. Да дэнамінацыі я неаднаразова бачыў, як на зямлі валялiся адразу некалькі 100-рублёвых купюр. І іх ніхто не паднімаў, нават дзеці. Сёння амаль у кожнай сям'і ёсць невялікая скарбонка, куды малыя хаваюць свае капіталы. Дзіўна, але і ад манеты наміналам у адну капейку ў гэтым выпадку ніхто з дзетак не адмаўляецца. Сёння мы самі пачалі больш пазітыўна ставіцца да нацыянальнай валюты.

## Наш BYN мае вагу

Эксперты эканамічных тэорый на гэтым не спыняюцца. Вельмі важнай умовай для прадухілення больш сур'ёзных грамадскіх праблем з'яўляецца ўпэўненасць уладальнікаў наяўнасці ў магчымасці свабодна і без праблем абменьваць свае грошы, лічаць яны. Калі такой упэўненасці няма, то ўзнікае ажыятажны попыт на тавары і замежную валюту. Імкненне хутчэй пазбавіцца ад старых грашовых знакаў вылівaецца ў куплю ўсяго, што здаецца ўкладаннем капіталу. Гэта, у сваю чаргу, падганяе рост цэн і, як вынік, паскарае інфляцыю ці вядзе да дэфіцыту, які, у рэшце рэшт, таксама вядзе да абясцэньвання нацыянальнай грашовай адзінкі і росту цэн.

А такое ў нас ужо было некалькі гадоў таму, калі ў людзей былі праблемы з набыццём амерыканскай валюты (якая потым падаражэла больш чым на 30%). Тады насельніцтва мяхамі набывала макароны і кансервы, купляла адразу па некалькі тэлевізараў ці халадзільнікаў. Нешта падобнае аналітыкі прадказвалі і пасля дэнамінацыі.

Гэтага не адбылося. Нагадаю, што да 1 ліпеня абазначэнне нашай валюты пры электронных разліках значылася як BYR, а пасля дэнамінацыі стала BYN. Новая валюта без мноства нулёў у першых дзён паказала, што яна мае вагу. Калі летам людзі яшчэ больш набывалі замежнай валюты, чым яе прадавалі, то восенню сітуацыя кардынальна змянілася. Курс долара застаўся стабільным, а часам «амерыканец» нават таннеў. Таму насельніцтва ўжо масава не набывае долары з заробкаў, бо гэта ўжо не мае сэнсу. Больш таго, у апошнія месяцы мы замежную валюту значна больш прадаём, чым купляем.

> **Негатыўныя наступствы дэнамінацыі з'яўляюцца часовымі, а ранейшы ціск «лішніх нулёў» на эканоміку аказваўся велічынёй пастаяннай.**

## Прывучыць да «пластыку»

Ад капеек за 20 гадоў усе адвыклі, таму атрымліваць рэшту манетамі нам яшчэ неяк складана. Асабліва гэта датычыцца пенсіянераў з дрэнным зрокам. Для іх уся гэта металічная дробязь амаль «на адзін капыл», таму і памыліцца лёгка. Але выйсце ёсць. Ва ўсім свеце альтэрнатывай «кэшу» з'яўляюцца безнаяўныя плацяжы. Але спачатку трэба навучыцца хутка і заўсёды карыстацца пластыкавымі карткамі.

Усе ранейшыя намаганні па актывізацыі безнаяўнага сектара прыносілі да гэтага часу мінімальны эфект. А тут прыйшла дэнамінацыя і вымусіла людзей масава займацца фінансавай азбукай, а потым... Рэкордная актыўнасць сярод уладальнікаў банкаўскіх картак была адзначана ў нашай краіне ў другой палове лета. Тэндэнцыя працягваецца і зараз. Усяго за некалькі месяцаў сярэдняя колькасць безнаяўных трансакцый на адну картку павялічылася больш чым у два разы. Цікава, але людзі цяпер пачалі аплачваць «пластыкам» не толькі камунальныя паслугі і мабільных аператараў праз інфакіёск, а ўвогуле заўсёды ў магазінах, барах, сталоўках — паўсюдна, дзе ёсць магчымасць.

## Аб буйных купюрах папярэдзіць загадзя

Яшчэ напярэдадні старту дэнамінацыі спецыялісты Нацбанка казалі, што банкноты наміналам 500 рублёў у банкаматы запраўляць не будуць, а заказаць іх можна будзе непасрэдна ў вашым банку. Так і адбылося. Цяпер банкаматы не запраўляюць купюрамі па 500 і 200 рублёў, ды і старублёўкі сустракаюцца не паўсюдна. Таму калі вам прапануюць абмяняць буйныя грошы ў прыватным парадку, то лепей адмовіцца.

Увогуле жартаваць з нацыянальнай валютай я не раіў бы нікому, бо гэта бокам можа выйсці. Выпадкі такія ўжо былі. Фальшыўкі рабіліся на звычайнай паперы і лёгка выяўляліся.

А яшчэ некалькі слоў пра сувенірныя грошы. У галоўным упраўленні наяўнага грашовага абарачэння Нацбанка нам паведамілі, што выраб выявы банкнот можа выконвацца на матэрыяльных і нематэрыяльных носьбітах. Але пры гэтым ёсць пэўныя ўмовы: пры аднабаковай выяве носьбіта памер копіі павінен складаць менш за 75% або больш за 125% ад рэальнага памеру банкнот. Пры двухбаковым выкананні — менш за 50% або больш за 200% ад арыгінала.

Асабліва рукастых таварышаў спецыялісты Нацбанка папярэджваюць, што выкананне выявы манет можа рабіцца на любых матэрыяльных і нематэрыяльных носьбітах, за выключэннем сплаваў металаў. З пластмасы — калі ласка, можаце рабіць; пачаў капіраваць манету з металу — нажывеш непрыемнасці.

## Лыжка дзёгцю

Недзе год таму спецыялісты банкаўскага сектара абяцалі нам пасля дэнамінацыі (1 ліпеня) прапанаваць спецыяльныя банкаматы, якія будуць выдаваць наяўныя нават манетамі. Таксама казалі, што з'явяцца і такія інфакіёскі, дзе нашы новыя манеты будуць прымацца машынай. Я жыву ў Мінску, але нідзе такой цуда-тэхнікі не бачыў.

На жаль, ёсць і пэўныя відавочныя мінусы дэнамінацыі. Ужо некалькі апошніх тыдняў у крамах адчуваецца вострая недахоп дробязі, прадаўцы не могуць даць рэшту. Старыя купюры практычна вывелі з абарачэння, а новыя манеты яшчэ проста не паспелі ў неабходным аб'ёме завезці ў крамы. Магчыма, гэта звязана з адсутнасцю вопыту пераходу на прынцыпова новыя грошы. Застаецца спадзявацца, што ў новым годзе падобных праблем у нас ужо не будзе.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

**У тэму**

## Банкі павінны будуць прымаць ад суб'ектаў гаспадарання грошы ўзору 2000 года і пасля 31 снежня

Асаблівасці прыёму банкамі наяўных грошай ад суб'ектаў гаспадарання выкладзены ў лісце Нацыянальнага банка камерцыйным банкам.

Там, у прыватнасці, гаворыцца, што ў апошнія шэсць месяцаў арганізацыі гандлю (сэрвісу) абавязаны былі прымаць да аплаты грашовыя знакі ўзору 2000 года і грашовыя знакі ўзору 2009 года і выдаваць імі рэшту. Суб'екты гаспадарання самастойна ў пісьмовай форме вызначаюць парадак і тэрміны здачы наяўных грошай у банк. Пры гэтым юрасобы здаюць наяўныя грошы ў банкі ў адпаведнасці з вызначанымі імі тэрмінамі як штодня, так і адзін раз у некалькі дзён ці адзін раз у месяц. Такім чынам, пасля 31 снежня 2016 года ў саставе наяўных грошай, якія здаюцца суб'ектамі гаспадарання ў банкі, могуць прысутнічаць грашовыя знакі ўзору 2000 года. «У сувязі з гэтым банкам неабходна забяспечыць прыём ад суб'ектаў гаспадарання наяўных грошай, у тым ліку грашовых знакаў узору 2000 года, якія здаюцца імі пасля 31 снежня 2016 года, у адпаведнасці з вызначанымі імі тэрмінамі здачы наяўных грошай», — гаворыцца ў лісце.

■ Сітуацыя

## Рызыкі заўтрашняга дня трэба ведаць сёння

### Сістэму прагназавання сацыяльна-эканамічнага развіцця вывучалі ў верхняй палаце парламента

**Выязны семінар для членаў Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах на гэту тэму прайшоў у Навукова-даследчым эканамічным інстытуце пры Міністэрстве эканомікі. Дырэктар інстытута Аляксандр ЧАРВЯКОЎ расказаў пра сучасныя трэнды, якія на нас уплываюць:**

— Калі мы распрацоўваем Нацыянальную стратэгію ўстойлівага развіцця Рэспублікі Беларусь, улічваем усе напрамкі, якія складваюцца ў свеце і нейкім чынам могуць паўплываць на нашу эканоміку. Напрыклад, сельская гаспадарка. Мы кажам, што сёння змяненне клімату ідзе з поўдня на поўнач. У нас у Беларусі ўжо змяшчаюцца кліматычныя зоны. Так, навукоўцы паведамляюць, якім чынам праз 15 гадоў зменіцца тэмпература, што пацягне за сабой з'яўленне іншых раслін і тэхналогій. І да гэтага мы павінны рыхтавацца сёння. Другі трэнд — старэнне насельніцтва, і сёння гэта з'яўляецца дастаткова сур'ёзнай праблемай не толькі для нас, але і для еўрапейскіх краін. Адна з рызык, якая чакае ў 2030 годзе, — тое, што нагрузка на тысячу працаздольных узрасце на 30%. Гэта адаб'ецца на бюджэце па выплаце і падтрыманні ўзроўню пенсій. Так, мы выходзілі з ініцыятывай змены пенсійнага ўзросту. Такое стратэгічнае планаванне дае магчымасць зазірнуць у будучыню і знайсці тыя балючыя пытанні ў перспектыве, якія мы можам абмеркаваць, і прыняць адпаведныя рашэнні.

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*


## ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

**Государственное производственное объединение**

**«Минскстрой»**

*220050, г. Минск, ул. К. Маркса, 13А*

режим работы: с 8.30 до 17.45, перерыв 13.00–14.00,
тел.: 327-52-36, 226-03-01

Зарегистрировано решением Мингорисполкома от 18 января 2007 г. № 140 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 100071325.

Сведения о жилых домах, в строительстве которых, выполняя функции заказчика, принимал участие застройщик в течение 3 лет, предшествующих опубликованию настоящей декларации, с указанием фактических сроков строительства:

- пр-т Газеты «Правда», д. 3 – 24 мес., ул. Панченко, д. 10 – 11 мес., ул. Панченко, д. 10А – 12 мес., ул. Матусевича, д. 56 – 23 мес., ул. Щорса, д. 1 – 41 мес., ул. Налибокская, д. 34 – 20 мес., ул. Одинцова, д. 54 – 13 мес., ул. Г. Ширмы, д. 7 – 18 мес., пр-т Газеты «Правда», д. 1 – 15 мес., ул. Одинцова, д. 56 – 13 мес., ул. Горецкого, д. 36 – 13 мес., ул. Академика Высоцкого, д. 3 – 9,8 мес.

Объединение осуществляет строительство объекта **«Группа жилых домов и надземная гараж-стоянка в микрорайоне № 7 пос. «Восточный». Вторая очередь строительства. Многоквартирный жилой дом № 5 по генплану»**.

Свидетельство (удостоверение) № 500/1032-13152 о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права пользования на него от 21 августа 2015 года.

Земельный участок площадью 0,760 га.

Проектом предусмотрено строительство двухсекционного 19-этажного 264-квартирного жилого дома в конструкциях серии М111-90 с техническим подпольем и теплым чердаком.

Начало строительства жилого дома – 31 декабря 2015 года.

Предполагаемый срок ввода в эксплуатацию в соответствии с ПОС – 15 июня 2017 года.

Проектно-сметная документация прошла в установленном порядке государственную экспертизу (заключение от 19.05.2014 № 275-15/14, дополнения к заключению от 25.08.2014 № 704-15/14; от 11.11.2016 № 767-15/16).

Договор строительного подряда от 29.12.2015 №199с-12-15, генподрядчик – ОАО «МАПИД».

Договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться с гражданами, нуждающимися в улучшении жилищных условий по направлениям в соответствии с решениями Мингорисполкома от 03.03.2016 г. № 599; от 15.12.2016 г. № 3762.

Предметом договора будет являться строительство жилого помещения.

Стоимость строительства 1 кв. метра общей площади жилых помещений с выполнением внутренних отделочных работ в текущих ценах составляет 976,93 руб.

Первоначальный взнос при условии оплаты согласно графику платежей составляет 20% от стоимости квартиры, оплата должна быть произведена дольщиком в течение 10 (десяти) банковских дней со дня регистрации в Мингорисполкоме договора создания объекта долевого строительства.

В состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое подлежит передаче в долевую собственность, входят: межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыша, технические этажи и подвал, другие места общественного пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и нежилых помещений.

Заявления о долевом строительстве жилых помещений будут приниматься (регистрироваться) через 5 календарных дней, а договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться через 7 календарных дней после опубликования настоящей декларации в кабинете 105, по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13А непосредственно с гражданами, подавшими заявления, либо с их представителями, действующими на основании доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке.

*Заместитель генерального директора С.Ф. Рута*

# «Святы вечар добрым людзям»

## Калядкі блізка — каўбаскі нізка

**На працягу ўсяго снежня гледачы тэлеканала «Беларусь 3» разам з праектам «Наперад у мінулае» вандравалі па розных рэгіёнах Беларусі, вывучалі, як у нас калядуюць, а таксама збіралі святочныя калядныя песні. Сёння згадваем экспедыцыі ў Шумілінскі і Гарадоцкі раёны Віцебскай вобласці, куды разам са здымачнай камандай праграмы ездзіў і наш карэспандэнт. Думаецца, многія сем'і беларусаў ужо рыхтуюцца заўтра з'есці посную куццю, а ў нядзелю святкаваць напоўніцу. Таму нашы назіранні, парады і тэксты песень могуць сапраўды спатрэбіцца.**



Калядуюць удзельнікі гурта «Гульбічы» Шумілінскага раёна.

### Свята, якое яднае

Пачну, напэўна, крыху здалёк. Неяк мы з аднакласнікамі надумалі пакалядаваць. Пайшлі ў бібліятэку, узялі фальклорныя зборнікі, склалі сцэнарый, распісалі ролі. І ў вызначаны вечар група сямікласнікаў выправілася ў вялікую дарогу па вёсцы. Заходзілі да настаўнікаў, суседзяў, знаёмых. Пакалядавалі на славу, доўга елі прысмакі, якімі нас шчодра пачаставалі. Усім, да каго завітвалі, вельмі падабалася такое віншаванне з Калядамі, таму і на наступны год таксама вырашылі прадоўжыць традыцыю. І вось тады адбылася гісторыя, якая і сёння «жыве» ў нашай сям'і і ў сем'ях аднавяскоўцаў.

На той раз роля Казы дасталася мне. Я весела танцавала, падала — як мае быць, але ў адной з хат не надта добра агледзела «пляцоўку» для падзення і проста з усёй сілы, да зорачак у вачах, стукнулася галавой аб куфар. На шчасце, мы тады калядавалі ў кватэры галоўнага ўрача мясцовай бальніцы і яго жонкі, старшай медсястры. Таму хуткая дапамога Казе была аказаная, і групка калядоўшчыкаў зноў накіравалася па сваім маршруце.

Сёння дзіву даёмся, калі згадваем, што сямікласнікі самі арганізавалі калядаванне — без дапамогі настаўнікаў і бацькоў. Самі склалі сцэнарый, зрабілі касцюмы, вывучылі песні і падрыхтавалі патрэбны «рэквізіт». Але думаецца, што справа менавіта ў чароўнасці самiх Каляд, яны аб'ядноўваюць, настройваюць на згоду і лад у сям'і, калектыве, паміж сябрамі. Спрадвек у Беларусі абыходныя абрады, удзельнікі якіх заходзяць у хаты да суседзяў, сяброў, проста знаёмцаў, накладаюць істотны адбітак на ўсю вясковую грамаду. Тут вельмі важна не абмінуць хаты, усіх заўважыць і прывітаць, усім пажадаць шчасця і дабрабыту ў новым годзе. Вось таму падчас калядавання беларусы традыцыйна не скупіліся на добрыя словы, а гаспадары, якія прымалі і сёння прымаюць калядоўшчыкаў, — на пачастункі.

### Го-го-го, Каза!

У розных рэгіёнах Беларусі Каляды святкуюць па-рознаму. На Лепельшчыне спраўляюць гульню «Жаніцьба Цярэшкі», на Бярэзіншчыне «Цягнуць Каляду на дуба», а на Клічаўшчыне праводзяць дзіцячы абрад «Куры». Але і гурт «Гульбічы» Шумілінскага Дома культуры, і калектыў «Спадарыня» Бычыхінскага Дома культуры Гарадоцкага раёна зладзілі для нас традыцыйнае, калі можна так сказаць, класічнае калядаванне. Абодва гурты аднавілі абрады, якія бытавалі ў гэтых мясцовасцях шмат дзесяцігоддзяў таму.

Цікава, што хоць Шуміліншчына і Гарадоччына мяжуюць, але і песні, якія спяваюць калядоўшчыкі, і звычаі крыху адрозніваюцца. Так, у Бычысе абрад больш імправізаваны, з выдатнымі мясцовымі спевамі, а на Шуміліншчыне вас чакае ледзь не цэлы калядны спектакль, які пачынаецца ўжо па дарозе да дома, дзе чакаюць калядоўшчыкаў. Падышоўшы да акна хаты, удзельнікі абраду звяртаюцца да гаспадыні:

*— Гаспадынечка, сустракай гасцей!*

*— А хто ж вы такія будзеце,* — мусіць запытацца яна. Ёй адказваюць вельмі паэтычна:

*— Ідзём з таго краю свету ад самага пана Лета. Ідзём ад пана Года, які носіць бараду шырокую, як лапату, сіву ды калмату. А ці шырокія ў цябе, гаспадыня, сцены, каб нам патанцаваць?*

У Бычысе калядоўшчыкі вітаюць гаспадароў песняй у двары, дзе згадваюцца імёны тых, да каго прыйшлі калядаваць. Таксама ў пачатку абраду спяваюць такую песню:

*Ой рана-рана куры*
*запелі*
*Святы вечар добрым*
*людзям.*
*Куры запелі*
*на тры празнічкі:*
*Першы празнічак —*
*святое Раство,*
*Другі празнічак —*
*свята Васіля,*
*Трэці празнічак —*
*свята Хрышчэння.*

Склад групы калядоўшчыкаў звычайна досыць традыцыйны. Паперадзе ідзе чалавек з зоркай у руках, з ім мусіць ісці Каза — сімвал старога і новага года. Цыган з цыганкай вядуць Мядзведзя, які будзе весяліць гаспадароў смешнымі сцэнкамі. Натуральна, у групе калядоўшчыкаў многа спевакоў, танцораў, могуць ісці таксама Дзед і Баба.

— Мы не самі ідзём, а Казу вядзём, — кажуць на Шуміліншчыне.

Каза мусіць красавацца перад гаспадарамі, кланяцца і танцаваць — каб жыта было многа ў наступным годзе. А калі некаму выпадзе магчымасць патанцаваць з Казой — таму ўвесь год будзе шанцаваць.

На Гарадоччыне гэты момант суправаджаецца адметнай песняй:

*Го-го-го, Каза,*
*го-го-го шэра,*
*Паварочайся,*
*не забывайся*
*То на рожанькі,*
*то на ножанькі,*
*То на капыцікі*
*залаценькія.*
*Павярніся зграбна,*
*пакланіся складна.*
*А дзе ж ты хадзіла?*
*А што ты рабіла?*

Пасля танцаў Каза павінна ўпасці. Гэта сімвалічнае дзеянне паказвае смерць старога года і перараджэнне ў год новы. Таму і стараюцца Казу пачаставаць, абдарыць — каб год быў спрыяльным.

Паказвалі і Мядзведзя: ён рухамі паказваў, як гаспадыня цеста месіць, як дзеўкі глядзяцца ў люстэрка, на танцы збіраюцца. Як мужыкі на працу ідуць і як — з працы. Важнай часткай калядавання была сімвалічная варажба цыганкі. Сваю магічную сілу яна пацвярджае такімі словамі:

— Маю ў адной кішэні вош у капкане, а ў другой — блыху на цапу. Магу паваражыць, а магу і прываражыць.





Калядоўшчыкі калектыва «Спадарыня» Бычыхінскага Дома культуры Гарадоцкага раёна.

Варажыла цыганка на картах ці на саломе. Калі гаспадар выцягне доўгую саломінку, то і ўраджай будзе добры. Але ў любым выпадку ўсе знакі яна інтэрпрэтуе як станоўчыя і суправаджае добрымі пажаданнямі:

— Першая радасць у дамочку, другая — у кашалёчку, а трэцяя — у чыстым полі, каб жыта радзіла.

Таму і не дзіўна, што пасля такіх выдатных пажаданняў, абрадавых дзеянняў, спеваў і танцаў з калядоўшчыкамі гаспадары імкнуліся іх абдарыць як мага больш шчодра і як мага ласкавей падзякаваць, што «завіталі, наш дом не мінавалі». Натуральна, калядоўшчыкі «падбухторвалі» гаспадароў спецыяльнымі песнямі. Напрыклад, як вось гэтая, якую мы пачулі на Шуміліншчыне:

*Схадзі, бабка,*
*каля печкі,*
*Пашукай нам перапечкі,*
*Схадзі, бабка,*
*каля кваскі,*
*Пашукай жа там*
*каўбаскі.*
*Вынесь сала,*
*не скупіся,*
*Каб твой ячмень*
*урадзіўся...*

Традыцыйная культура беларусаў надзвычай шматгранная. Але менавіта ў абрадзе калядавання, як, дарэчы, і ў Велікодным валачаванні, хаваецца адна важная рыса нашага народа — імкненне ўсіх адарыць увагай, добрымі пажаданнямі, павіншаваць са святам і прынесці кавалачак радасці ў кожны дом, незалежна ад таго, заможныя гаспадары ў ім жывуць ці сціплыя, бяднейшыя.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*

**У Беларусі і дагэтуль дзе-нідзе бытуюць прыкметы, звязаныя з Калядамі. Напрыклад, ад першага дня Каляд да Шчадраца (першага дня новага года па старым стылі) не пяклі хлеб і бліны, каб не было «пякоткі». Стараліся не разбіць у гэты час нічога з посуду, каб ён не біўся ўвесь год. Сабранае смецце не выкідвалі на сметнік, а збіралі і толькі пасля свята выносілі на балота. Верылі, што гэта дапаможа абараніць поле ад пустазелля. Асцерагаліся ў гэтыя дні пазычаць, каб свойская жывёла «не цягалася па вёсцы». А па тым, якога полу будзе першы, хто завітае ў госці на Каляды, меркавалі аб з'яўленні адпаведнага полу прыплоду ў гаспадарцы. Таксама маглі прадказваць, ці будзе здаровай сям'я: калі ў хату ў першы дзень Калядаў зойдзе мужчына — хварэць ніхто не будзе, а калі жанчына — нехта можа занядужаць.**

## «ЗВЯЗДА» НА СВЯТЫ ДОРЫЦЬ... СУВЯЗЬ!

А што, як не сувязь, самае галоўнае сёння ў адносінах паміж людзьмі? Зыходзячы з гэтага меркавання, мы ў якасці прызоў для розыгрышу сярод падпісчыкаў гэтым разам прапануем прылады для камунікацыі з блізкімі людзьмі і з усім астатнім светам — тэлефоны і планшэт.

Тэлефонам сёння нікога не здзівіш, але тут мы падумалі найперш пра нашых сталых чытачоў і пра маладзейшых, якія клапоцяцца аб сваіх бацьках. Зручная клавіятура з вялікімі, добра бачнымі кнопкамі, вялікі экран, дзве SIM-карты — выдатны падарунак для старэйшага ў вялікай і дружнай сям'і. Не забыліся і пра малодшых — галоўны прыз рэкламнай гульні — сучасны планшэт, які падтрымлівае сувязь фармату 4G і мае шмат іншых цікавых і патрэбных функцый.

Каб стаць удзельнікам розыгрышу гэтых патрэбных падарункаў, варта толькі аформіць падпіску на газету «Звязда» на I квартал або I паўгоддзе, запоўніць адзін з купонаў, якія будуць змяшчацца ў газеце на працягу снежня, выразаць яго і даслаць на адрас рэдакцыі. Магчыма, фартуна абярэ менавіта вас.

Выпісвайце «Звязду» — будзьце заўжды на сувязі!

Умовы рэкламнай гульні «На сувязі са «Звяздой» змешчаны ў нумары ад 3 снежня.

Планшэт Asus ZenPad 10 Z300CNL-6A025A 000



Мабільны тэлефон Fly FF241 чорны



**Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на I квартал і I паўгоддзе 2017 года**

Прозвішча, імя, імя па бацьку ____________________

____________________

Падпіска аформлена і аплачана ў ____________________
(аддзяленне сувязі)
на I квартал і I паўгоддзе 2017 года

Хатні адрас і тэлефон (абавязкова) [ ] (індэкс) ____________

____________________

____________________

Удачы ў розыгрышы!

## ЧЫТАЙЦЕ Ў «ЗВЯЗДЗЕ» ЎЖО Ў СТУДЗЕНІ

**Як пазбегнуць анкалогіі і папярэдзіць гіпертанію?**

**Кожны падпісчык «Звязды» атрымае ў 2017-м падарункі — насценны каляндар, каляндар свят усіх канфесій, каляндар народных свят, Месяцавы каляндар садавода-агародніка.**

**ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!**

## Серада, 28 снежня

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.40** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 0.00** Зона Х.
**9.10 Меладрама «Ісціна ў віне». Заключная серыя.**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.00, 20.00 Серыял «Жаночы доктар-2».**
**12.10, 16.30 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».**
**13.20** Дзень у вялікім горадзе.
**14.20** Дзіцячы доктар.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25 Серыял «І шарык вернецца».**
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20, 0.20** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.45** Спецыяльны рэпартаж.
**22.15 Серыял «След».**
**0.55** Дзень спорту.
**1.10 Серыял «Пастка».**

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 22.05** Тэлебарометр.
**9.05, 18.10 Серыял «Кухня».**
**10.10, 17.15 Дэтэктыў «Такая работа».**
**11.00, 20.20** «Экстрасэнсы-дэтэктывы».
**12.00, 16.20 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».**
**13.00, 19.15** «Багіня шопінгу». Фэшн-шоу.
**14.05** «Каханне анлайн». Рэаліці-шоу.
**15.20** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**16.00, 1.00** «Анлайн 2.0». Скетчкам.
**21.25 Серыял «Мая цудоўная нянька».**
**22.00** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**22.10** «Як гартаваўся стайл». Сіткам.

**0.10** «Арол і рэшка. Шопінг». Трэвел-шоу.

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35** «Беларуская кухня». Бабенькі.
**8.05, 12.10, 21.05** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 18.10 «Кліч продкаў». Серыял.**
**9.05, 15.30 «Прызначаешся ўнучкай». Маст. фільм.**
**11.20** М/ф.
**11.40** «Святло далёкай зоркі». Памяці актрысы тэатра і кіно, народнай артысткі СССР Галіны Макаравай.
**12.25** «Наперад у мінулае».
**12.50** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**13.25, 21.20 «За двума зайцамі». Камедыя.**
**14.35** Анталогія «Славянскага базару». «Славянскі базар у Віцебску-2015».
**17.45, 22.35** «Дыя@блог». Пра прыгожае.
**19.00** «Гісторыя Беларусі».
**19.10 «Пацалунак Сакрата». Дэтэктыў. «Плача анёл Шагала». 2-я серыя.**
**20.00** «Навагодні тыдзень». Канцэрт ВІА «Синяя птица».
**20.40** «Калыханка».

### Беларусь 5

**8.00, 19.15, 0.25** PRO спорт. Навіны.
**8.10** Авертайм.
**8.40** Спорт-кадр.
**9.10** «Два бакі алімпійскага медаля». Дар'я Навумава.
**9.40** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Нёман» (Гродна) — «Юнацтва» (Мінск).
**11.40, 13.40, 16.55, 22.10** Хакей. Кубак Шпенглера.
**15.40** Козел пра футбол.
**16.00** Танцавальны спорт. Міжнародны турнір.
**19.25** Хакей. КХЛ. ЦСКА (Масква) — «Дынама» (Масква).
**21.40** Слэм-данк.

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!»
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.10** «Сяргей Бадроў. «У чым сіла, брат?»
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.15** «Пра каханне».
**15.10, 16.20** «Час пакажа».
**16.55** «Давай пажэнімся!»
**18.20** «Бесталковыя нататкі».
**18.55** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Выйсці замуж за Пушкіна».**
**22.55** «Вячэрні Ургант».
**23.40** «Давай пажэнімся!»
**0.40** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30, 23.05** «Тайны Чапман».
**9.30, 18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**10.40** «Сямейныя драмы».
**11.40** «Не хлусі мне!»
**12.35, 17.35** «Званая вячэра».
**13.50** «Тэрыторыя памылак».
**15.30 «Следакі». Серыял.**
**16.50** «Аўтапанарама».
**17.10** «Ведай нашых!»
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Сакрэтныя тэрыторыі».
**22.05** «Глядзець усім!»

**0.00** «Зорны рынг. Навагодняя бітва хітоў «Назад у 70-я!»
**1.00** Дакументальны спецпраект: «Пячатка лёсу ў кожнага свая».

### МІР

**6.00** М/ф.
**7.30** Добрай раніцы, свет!
**9.00 Маст. фільм «Лёд у кававай гушчы».**
**10.40 Маст. фільм «Вясёлая моладзь».**
**12.30** «Цяжар абеду».
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15, 19.20 Серыял «Даішнікі-2».**
**16.15 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**17.55** «Мой лепшы сябар».
**21.05 Маст. фільм «Сірата казанская».**



**22.40 Маст. фільм «Як тры мушкецёры».**
**1.05 Серыял «Невідзімкі».**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**12.00** «60 хвілін». Ток-шоу.
**13.15** «Правілы жыцця».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.40** «Прамы эфір».
**17.20 Серыял «Вясна ў снежні».**
**19.10, 20.40 Серыял «Па гарачых слядах».**

**21.45, 23.10 Серыял «Свая чужая».**
**23.40 Серыял «Рая ведае».**

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00** «Новая раніца».
**7.25** «Студыя Юліі Высоцкай».
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.10 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.20 Серыял «Ляснік».**
**12.00** Суд прысяжных.
**13.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05 Серыял «Хвост».**
**16.25 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**18.05** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.40 Серыял «Мент у законе».**
**23.10** «НЗ.by».
**23.30** «Вынікі дня».
**0.00 Серыял «Марскія д'ябли».**

### 8 канал

**7.00** Раніца на «Восьмым».
**10.30** «Адшукваецца адпачынак».
**11.00 Трылер «І грымнуў шторм».**
**13.00 Серыял «У кожнага свая вайна».**
**13.50** «Хатняя крама».
**14.20 Камедыя «Мініно».**
**16.00, 19.20, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**16.05** «Мультпарад». «Цар Салтан».
**17.10 Серыял «Вікторыя».**
**18.00 Серыял «Падмані мяне».**
**18.50** «Мой любімы гадавальнік».
**19.25 Серыял «Флэш».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05 Прыгоды «Парк Юрскага перыяду».**
**23.10 Серыял «Ганібал».**

### ВТВ

**6.00** «Турбаміксер».
**7.00, 18.00** Серыял «Варонины».
**8.00** «Ералаш».
**8.20** М/ф «Смяшарыкі».
**8.50** М/ф «Фіксікі».
**9.10** М/ф «Маша і мядзведзь».
**9.30** Камедыя «Ёлкі 2».
**11.40, 14.40, 20.20** Серыял «Гатэль «Элеон».
**12.50** «Пасцець за 24 гадзіны».
**14.00, 4.00** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**15.50, 19.10** Серыял «Вечны водпуск».
**17.00** «Уральскія пельмені».
**21.30** Камедыя «Ёлкі 3».
**23.30, 4.30** Серыял «Тут нехта ёсць...»
**1.20** Серыял «Бязмоўны сведка».
**3.20** Скетч-шоу «6 кадраў».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 0.20** Навіны культуры.
**10.15, 1.55** «Назіральнік».
**11.15, 20.50** «Шлюб па-італьянску». Маст. фільм.
**13.00** «Пешшу...» Масква гатычная.
**13.30** Успамінаючы Зінаіду Шарко. «Актрыса на ўсе часы». Дак. фільм.
**14.10** Па слядах тайны. «Калі на Зямлі кіравалі багі».
**15.10** Канікулы! «У пошуках капітана Гранта». Маст. фільм.
**17.25** Міжнародны музычны фестывалі. Зальцбург. Юрый Башмет, Гідон Крэмер, Міцука Уціда, Рыкарда Муці і Венскі філарманічны аркестр.
**18.40** «Бляск і горкія слёзы расійскіх імператрыц». Дак. серыял.
**19.10** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** Галоўная роля.
**20.05** «Уладзімір Співакоў. Дыялогі з Саламонам Волкавым». Дак. серыял.
**22.30** С. Пракоф'еў. «Папялушка». Тэадор Курэнтзіс і аркестр musicAeterna Пермскага тэатра оперы і балета імя П.І. Чайкоўскага.
**0.35** «Мядзведзь». Маст. фільм.
**1.25** «Абрабаванне па...- 2». «Доўгі мост у патрэбны бок». Мультфільмы для дарослых.

### Настальгія

**6.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым. «Аляксандр Гадуноў». 2005 год.
**7.00, 8.30, 9.40, 11.00, 14.50, 15.40, 17.00, 20.35, 21.40, 23.00, 1.00, 2.55** Музычная настальгія.
**7.30** Тэлеспектакль «Гадзіннік з зязюляй». 1978 год.
**9.00, 15.00, 21.00** «Мінулы час».
**10.00, 16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР».
**12.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Пачатак перабудовы: «сухі» закон». 2006 год.
**12.50** Фільм-спектакль «Пена». 1977 год.
**18.00** «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар. 2008 год.
**19.00** Фільм-спектакль «Таблетку пад язык». 1978 год.
**0.00** «Народжаныя ў СССР». Гурт Яўгена Маргуліса. 2013 год.
**1.40** «Зямля—Паветра». Гурт «TOTAL». 2003 год.
**3.30** Маст. фільм «Не бойся, я з табой».

### EuroSport 1

**3.30, 11.15, 13.30, 15.15, 19.00, 22.15, 0.45** Горныя лыжы. Кубак свету.
**4.30, 6.00, 16.30, 20.00, 2.30** Біятлон. Кубак свету.
**5.00, 7.30, 10.30** Фрыстайл. Кубак свету.
**6.30, 8.30, 17.00, 1.30** Скачкі з трампліна. Кубак свету.

### Кінакамедыя

**1.05** Камедыя «Няхай жыве Францыя!»
**2.50** Камедыя «Ён горшы за мяне».
**4.45** Камедыя «Выпадковы муж».
**6.30** Драма «Вундэркінды».



**8.30** Камедыя «Дробныя махляры».
**10.15** Меладрама «Гуляй, як Бэкхэм».
**12.15** Камедыя «Дзікая штучка».
**14.00, 14.50, 15.35** Скетчкам «Паміж намі».
**14.15, 15.05** «Камедыянты (Шоу)».
**16.00** Меладрама «Гісторыя кахання, або Навагодні розыгрыш».
**17.45** Камедыя «На кручку».
**19.30** Меладрама «Вясельны разгром».
**21.20** Камедыя «Вялікае вяселле».
**23.00** Камедыя «Забі мяне тройчы».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.35** «Ёсць адзін сакрэт».
**8.00** «Доктар І...»
**8.30, 18.55, 2.30** «Асколкі». Серыял.
**10.05, 4.30** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**11.50** «Сляпая».
**12.50** «Варажбітка».
**13.55** «Паралельны свет».
**14.55** «Здзелка».
**15.50** «Натуральны адбор».
**16.50, 21.45** «Рэвізора».
**17.55** «Тайны следства». Серыял.
**20.45** «Магазіна».
**22.50, 4.00** «Лінія абароны».
**23.20** «Звышнатуральнае». Серыял.
**0.05** «Людзі Ікс 3». Фантастыка.
**1.40** «Магазіна».

### ТБ1000

**6.10, 18.05** Фэнтэзі «Іствікскія ведзьмы».
**8.15** Меладрама «Прабач за каханне».
**10.20** Драма «Бачнасць гнеўу».
**12.25** Драма «Развітальны квартэт».
**14.20** Драма «Прыгажосць па-англійску».
**16.20** М/ф «Планета 51».
**20.10** Фільм-катастрофа «Пасейдон».
**22.10** Камедыя «Такія розныя блізняты».
**0.10** Драма «Дваццаць адно».
**2.20** Драма «Пробліск геніяльнасці».
**4.20** Драма «Самы блізкі сябар».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Камедыя «Выкрутасы».
**8.05** Трагікамедыя «Са мною вось што адбываецца».
**9.35** М/ф «Іван Царэвіч і Шэры Воўк 2».
**10.55** Трылер «Халодны фронт».
**12.35** Фантастыка «Масква—Касіяпея».
**14.20** Драма «Зялёная карэта».
**16.10** Камедыя «8 першых спатканняў».
**18.10** Драма «Адмиралъ».
**20.20** Камедыя «Пра што яшчэ гаворац мужчыны».
**22.20** Драма «Шык».
**0.15** Меладрама «Вораг нумар адзін».
**2.10** Меладрама «Афінскія вечары».
**4.20** Драма «Маскоўскі жыгала».

### National Geographic

**6.00** Гульні розуму.
**6.50, 9.25, 13.15, 17.05, 5.35** Навуковыя недарэчнасці.
**7.55, 14.00, 1.00, 4.05** Золата Юкана.
**8.40, 14.45, 1.45, 4.50** Незвычайныя промыслы.



**11.00** Шаша праз пекла.
**11.45, 15.30** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**12.30** Чалавек супраць YouTube.
**16.20, 19.25, 23.25, 3.20** Расследаванні авіякатастроф.
**18.35, 22.35, 2.30** Марс.
**20.10** 80-я: дзесяцігоддзе, якое стварыла нас.
**21.00** Выратаваць планету.
**0.10** Эвакуацыя Зямлі.

### Discovery

**8.00, 14.00** На краі Аляскі.
**9.00, 15.30, 21.30, 5.55** Як гэта ўстроена?
**9.30, 15.00, 21.00, 5.30** Як гэта зроблена?
**10.00, 16.00, 23.00, 7.10** Бітвы за кантэйнеры.
**10.30, 16.30, 23.30, 7.35** Паляўнічыя на склады.
**12.00** Ліквідатар.
**13.00** Паляўнічыя на рэліквіі.
**17.00, 22.00, 2.55** Махінатары.
**18.00** Майстры патаргавацца.
**0.00, 3.50** Залатая ліхаманка.
**1.00, 4.40** Самагоншчыкі.
**2.00, 6.20** А ты б вызыў?

## Усходні гараскоп на

**АВЕН.** Выкарыстайце гэты тыдзень для атрымання новай інфармацыі і ведаў. Звярнідце асаблівую ўвагу на тое, што адбываецца вакол вас. Засяроджанасць на сабе перашкодзіць заўважыць перамены. Захоўвайце эмацыянальную раўнавагу, але пры гэтым больш давярайце інтуіцыі. Паспрабуйце праявіць цярпенне і не прыспешвайце падзеі. Ініцыятыўнасць, якая спалучаецца з тонкай дыпламатыяй, дазволіць найлепшым чынам уладзіць любыя непаразуменні з дзелавымі партнёрамі. Паспрабуйце абмеркаваць усе рабочыя пытанні да пятніцы. Таму што потым надыходзіць час адпачынку.

**ЦЯЛЕЦ.** Беражыце сваю рэпутацыю. Накіруйце сілы на захаванне ладу ў сям'і. Не адмаўляйцеся ад магчымасцяў прафесійнага росту. На працы справы будуць праходзіць размераным тэмпам, што можа і крыху нудна для творчых натур ці тых, хто ўжо настроіўся на адпачынак. Паездкі, запланаваныя на панядзелак, могуць сарвацца. У пачатку тыдня магчымы праблемы юрыдычнага характару. У аўторак і чацвер пастарайцеся быць паблажлівым да сябе і, калі зможаце, да навакольных. Выхадныя пройдуць у клопатах і святкаваннях.

**БЛІЗНЯТЫ.** У пачатку тыдня можна будзе парадавацца поспеху і будаваць светлыя планы на святы. Толькі не забывайцеся, як бы спрыяльна ні складваліся справы, спадзявацца вам можна выключна на ўласныя сілы. Зрэшты, каханы чалавек шчыра зацікаўлены, каб у вас усё было добра. Так што час больш раманткі вы ўпусціце ў сваё жыццё, тым лепш. Будзе шанц добра зарабіць на цікавым праекце і падняцца па кар'ернай лесвіцы, але будзьце гатовыя працаваць без перапынкаў на сон і абед. Святы настрояць вас на летуценны лад.

**РАК.** Актыўны тыдзень, які запатрабуе ад вас праяўлення рашучасці, не бойцеся распачаць важныя крокі, перагледзець погляды і змяніць тактыку паводзін. Паверце ў свае сілы, ганіце прэч ад сябе няўпэўненасць і страхі, якія могуць стаць перашкодамі для руху наперад. У панядзелак карысна дакладна спланаваць, што вы павінны паспець скончыць, каб спакойна сустрэць Новы год. У сераду можаце разлічваць на падтрымку сяброў і блізкіх людзей.

**ЛЕЎ.** Пара купляць падарункі і складаць меню святочнага застолля. Калі родныя або сябры захочуць дапамагчы, дамоўцеся, хто што прыгатуе. На гэтым тыдні будуць удалымі паездкі і кантакты, асабліва — камандзіроўкі за мяжу або стасункі з замежнікамі. Такое становішча спраў умацуе ваш аўтарытэт і павысіць самаацэнку. У першай палове тыдня вам варта разлічваць толькі на сябе і ўласнае ўменне сур'ёзна і ўраўнаважана дамаўляцца з апанентамі. Чацвер можа аказацца неспрыяльным днём, калі з-за прыкрых выпадковасцяў разбураюцца планы. Падзеі, што адбываюцца, трэба разглядаць як знакі лёсу.

**ДЗЕВА.** Вы будзеце занадта старацца, каб дагадзіць навакольным людзям, але гэта не перашкодзіць ім крытыкаваць вашы ўчынкі і ідэі. Не смуткуйце, сярэдзіна тыдня — выдатны момант для тых, хто славалюбівы і хоча праявіць сябе на працы з лепшага боку. Ваша добразычлівасць і прывабнасць дазволіць згладзіць вострыя вуглы ў складаных сітуацыях. У пятніцу ў вас можа з'явіцца арыгінальная ідэя, якую вы ўвасобіце ў найбліжэйшай будучыні. Паспрабуйце сустрэць Новы год у максімальна камфортнай абстаноўцы.

## наступны тыдзень

**ШАЛІ.** У панядзелак вам пажадана сачыць за сваімі выказваннямі, інакш з'явіцца рызыка трапіць у няёмкае становішча. У аўторак і чацвер можа спатрэбіцца дапамога сяброў і калег, інакш будзе складана справіцца з вялікім аб'ёмам працы. У сераду верагодныя добрыя навіны, звязаныя з перспектыўнымі прапановамі. Да канца тыдня не выключана непараразмеркаванне абавязкаў у працоўным калектыве, у выніку чаго асабіста вы можаце атрымаць большую самастойнасць.

**СКАРПІЁН.** Пажадана прытрымлівацца стратэгіі, якая выпрацавана раней. Вельмі хутка яна прынясе поспех, нават калі на вашым шляху і сустракаюцца перашкоды. Перадначагодні карпаратыў дакажа, што ў вашым калектыве склаліся цёплыя і сяброўскія адносіны з калегамі і начальствам. Калі ў чацвер да вас дойдзе непрыемная плётка — ігнаруйце яе і таго, хто яе прынёс: магчыма, вас спрабуюць пасварыць з блізкім чалавекам. Новы год лепш сустрэць дома, а вось у нядзелю не адмаўляйцеся ад запрашэння ў госці. Добра знаёмыя час, ды і новыя знаёмствы могуць аказацца вельмі своечасовымі.

**СТРАЛЕЦ.** Надыходзячы тыдзень — выдатны час для выканання дадатковай працы: за яе хутка і добра заплацяць. Самы час выкарыстоўваць сваю дзелавую хватку, падмацаваўшы дзеянні інфармаванасцю і надзейнымі сувязямі. Не перастарайцеся. Узяўшы ініцыятыву ў свае рукі і ўстанаўліваючы свае правілы гульні, вы можаце лёгка перайсці межы дазволенага. Аўторак — удалы дзень для запланаваных паездак. У чацвер верагодныя рэзкія змены настрою.

**КАЗЯРОГ.** На гэтым тыдні спатрэбіцца ўменне канцэнтравацца на працы і не звяртаць увагі на вонкавыя раздражняльнікі. У сераду магчымы нечаканасці, трэба будзе хутка і адэкватна рэагаваць на тое, што адбываецца, а спытаць парады не будзе ў каго. У чацвер лепш пазбягаць нядобразычліўцаў, не гаварыць лішняга і не рабіць нічога, што магло б вас скампраметаваць. У пятніцу пастарайцеся выправіць свае памылкі, каб нішто не перашкодзіла спакойна адпачываць і сустрэць Новы год у добрым настроі.

**ВАДАЛЕЙ.** Пастарайцеся адцягнуцца ад клопатаў і падумаць, што вам трэба зрабіць для сустрэчы Новага года. Самы час падрыхтавацца да свята, дарабіць старыя справы, прывесці ў парадак думкі. У аўторак можа паступіць інфармацыя, якая мае шанц сур'ёзна паўплываць на вашу кар'еру. У сераду, у адзін з самых спрыяльных дзён на гэтым тыдні, будзеце поўныя сіл і энергіі. Праца будзе гарэць у вашых руках. Начальства ацэніць гэту дзейную працаздольнасць, так што лавіце момант і не ўпусціце спрыяльных да сябе адносін. Паездка за горад на ўік-энд дазволіць адпачыць, набрацца сіл і энергіі.

**РЫБЫ.** Для працы і творчасці неабходна адчуць сябе свабоднымі, абмежаванні скоўваюць вас. Вам неабходная незалежнасць ва ўсім: і ў думках, і ў справах, і ў дзеяннях, а самае галоўнае — у рашэннях. Але калі вы будзеце занадта бескампрамісныя, то верагодныя канфлікты на працы. Можаце заблытацца ва ўласных жаданнях, у тым, што ў вас ёсць у руках, і ў тым, чаго вам хочацца. Абараняйце і адстойвайце свае інтарэсы, але карэктна і дыпламатычна. Пра новыя ідэі лепш пакуль нікому не расказваць: час яшчэ не прыйшоў.

## Чацвер, 29 снежня

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.35** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.55** Зона Х.
**9.10 Меладрама «Халодная страва». 1-я серыя.**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.00, 20.00 Серыял «Жаночы доктар-2».**
**12.10, 16.30 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».**
**13.20** Дзень у вялікім горадзе.
**14.20** Дзіцячы доктар.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25 Серыял «І шарык вернецца».**
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20, 0.15** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.45** Спецыяльны рэпартаж.
**22.15 Серыял «След».**
**0.55** Дзень спорту.
**1.05 Серыял «Пастка».**

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 22.10** Тэлебарометр.
**9.05, 18.10 Серыял «Кухня».**
**10.10, 17.15 Дэтэктыў «Такая работа».**
**11.00, 20.20** «Экстрасэнсы-дэтэктывы». Заключны выпуск.
**12.00, 16.30 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».**
**12.55, 19.15** «Багіня шопінгу». Фэшн-шоу.
**14.00** «Ікона стылю». Fashion-шоу.
**15.20** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**16.00, 1.00** «Анлайн 2.0». Скетчкам.
**21.25 Серыял «Мая цудоўная нянька».**
**22.00** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**22.15** «Як гартаваўся стайл». Сіткам.
**0.10** «Арол і рэшка. Шопінг». Трэвел-шоу.

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35** «Беларуская кухня». Аўсяны кісель і мачанка.
**8.05, 11.00, 21.10** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 18.05 «Кліч продкаў». Серыял, заключная серыя.**
**9.10, 15.30 «Лавіна». Драма.**
**11.15** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**11.45, 21.25 «Пра беднага гусара закіньце слова». Трагікамедыя.**
**14.30** Анталогія «Славянскага базару». Славянскі базар у Віцебску-2016».
**17.15, 0.10** «Дыя@блог». Пра мову.
**17.45** «Я хачу гэта ўбачыць!» Наваколле Гомеля.
**19.00** «Гісторыя Беларусі».
**19.10 «Пацалунак Сакрата». Дэтэктыў. «Тайна залатых апосталаў». 1-я серыя.**
**20.00** «Навагодні тыдзень». Сольны канцэрт Дзмітрыя Калдуна.
**20.40** «Калыханка».

### Беларусь 5

**8.00, 19.15, 0.25** PRO спорт. Навіны.
**8.10** Слэм-данк.
**8.35** Козел пра футбол.
**8.55** «Жанчыны і спорт». Вольга Мазуронак.
**9.25** Хакей для ўсіх.
**9.55, 13.55** Хакей. Кубак Шпенглера.
**11.55** Хакей. КХЛ. ЦСКА (Масква) — «Дынама» (Масква).
**15.55** Танцавальны спорт. Міжнародны турнір.
**16.55, 22.10** Хакей. Кубак Шпенглера. Плэй-оф.
**19.25** Хакей. КХЛ. СКА (Санкт-Пецярбург) — «Лакаматыў» (Яраслаўль).
**21.40** Фактар сілы.

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Навіны.
**6.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здарова!»
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.10** «Сам-насам з усімі».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.15** «Пра каханне».
**15.10, 16.20** «Час пакажа».
**16.55** «Давай пажэнімся!»
**18.20** «Бесталковыя нататкі».
**18.55** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05** «Трэба разабрацца».
**21.30 Драма «Марлен».**
**23.45** «Вячэрні Ургант».
**0.25** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30, 23.25** «Тайны Чапман».
**9.30, 18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**10.40** «Сямейныя драмы».
**11.40** «Не хлусі мне!»
**12.35, 17.35** «Званая вячэра».
**13.50** «Сакрэтныя тэрыторыі».
**15.40 «Следакі». Серыял.**
**16.10** «Скардзіцца дазваляецца».
**16.50** «Мінск і мінчане».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Дзіўная справа».
**22.05** «Глядзець усім!»
**23.05** «Аўтапанарама».
**0.15** «Зорны рынг. Навагодняя бітва хітоў «Назад у 80-я!»
**1.15** Дакументальны праект: «Навагоднія фільмы».

### МІР

**6.00** М/ф.
**7.30** Добрай раніцы, свет!
**9.00, 00.00 Маст. фільм «Сем нявест яфрэйтара Збруева».**
**10.45 Маст. фільм «Лёд у кававай гушчы».**
**12.30** «Цяжар абеду».
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15 Серыял «Дашнікі-2».**
**15.05** «Зроблена ў СССР».
**16.15 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**17.55** «Мой лепшы сябар».
**19.20 Серыял «Канькі для чэмпіёнкі».**
**22.45 Маст. фільм «Навагоднія прыгоды Машы і Віці».**
**1.50 Серыял «Невідзімкі».**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** «Уся Расія».
**12.00** «60 хвілін». Ток-шоу.
**13.15** «Правілы жыцця».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.40** «Прамы эфір».
**17.20 Серыял «Вясна ў снежні».**
**19.10, 20.40 Маст. фільм «Шэпт».**
**21.45, 23.10 Серыял «Свая чужая».**
**23.40** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**0.00 Серыял «Рая ведае».**

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00** «Новая раніца».
**7.25** «Студыя Юліі Высоцкай».
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.10 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.20 Серыял «Ляснік».**
**12.00** Суд прысяжных.
**13.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05 Серыял «Хвост».**
**16.25 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**18.05** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.40 Серыял «Мент у законе».**
**23.10** «НЗ.by».
**23.30** «Вынікі дня».
**0.00 Серыял «Марскія д'яблы».**

### 8 канал

**7.00** Раніца на «Восьмым».
**11.00 Камедыя «Афоня».**
**12.30 Серыял «У кожнага свая вайна».**
**13.25 Камедыя «Службовы раман».**
**16.10, 19.20, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**16.15** «Мультпарад». «Дзед Мароз і Шэры Воўк».
**16.35** «Мой любімы гадавanец».
**17.05 Серыял «Вікторыя».**
**18.00** «Хатняя крама».
**18.20 Серыял «Падмані мяне».**
**19.10** «Фэшн is my прафэшн».
**19.25 Серыял «Флэш».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**21.20 Камедыя «Таямнічы рабаўнік».**
**22.50 Серыял «Ганібал».**
**23.35** «Гэта здарылася зімой».

### ВТБ

**6.00** «Турбаміксер».
**7.00, 18.00** Серыял «Варонiны».
**8.00** «Ералаш».
**8.20** М/ф «Смяшарыкі».
**8.50** М/ф «Фіксікі».
**9.20** М/ф «Маша і мядзведзь».
**9.40** Камедыя «Ёлкі 3».
**11.40, 14.40, 20.20** Серыял «Гатэль «Элеон».
**12.50** «Паспець за 24 гадзіны».
**14.00, 4.00** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**15.50, 19.10** Серыял «Вечны водпуск».
**17.00** «Уральскія пельмені».
**21.30** Камедыя «Ёлкі 1914».
**23.40, 3.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**0.00** Еўрапейскі покерны турнір.
**0.50** Серыял «Бязмоўны сведка».
**3.00** «Дурні і дарогі».
**4.30** Скетчкам «Студэнты».
**5.00** «Мільёны ў сетцы».
**5.30** «Лаві момант».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.45** Навіны культуры.
**10.15, 1.55** «Назіральнік».
**11.15, 20.50** «Папялушка-80». Маст. фільм. 1—2-я серыі.
**12.50** «О. Генры». Дак. фільм.
**13.00** «Пешшу...» Масква сучасная.
**13.30** Успамінаючы Паўла Хомскага. «Тэатральны летапіс. Выбранае».
**14.10** Па слядах тайны. «Неверагодныя артэфакты».
**15.10** Канікулы! «У пошуках капітана Гранта». Маст. фільм.
**17.25** Міжнародныя музычныя фестывалі. Вальдбюнэ. Сэр Саймон Рэтл і Берлінскі філарманічны аркестр.
**18.40** «Бляск і горкія слёзы расійскіх імператрыц». Дак. серыял.
**19.10** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** Галоўная роля.
**20.05** «Уладзімір Співакоў. Дыялогі з Саламонам Волкавым». Дак. серыял.
**22.30** Кубанскі казацкі хор у канцэрце «Казакі Расійскай імперыі».
**0.00** «Каралеўскі генерал». Маст. фільм.

### Настальгія

**6.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Пачатак перабудовы: «сухі» закон». 2006 год.
**6.50** Фільм-спектакль «Пена». 1977 год.
**8.50, 9.40, 11.00, 14.50, 15.40, 17.00, 18.50, 21.40, 23.00, 1.00, 2.30, 3.40, 5.00** Музычная настальгія.
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**12.00** «Сяпем, сябры!» з Таццянай Візбар. 2008 год.
**13.00** Фільм-спектакль «Таблетку пад язык». 1978 год.
**18.00** «Эліта Краіны Саветаў». Анатоль Пук'янаў. 2007 год.
**19.05** «КВЗ — 87-88». МДУ — ДДУ — НДУ. Фінал.
**0.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым. «Аляксандр Гадуноў». 2005 год.
**1.30** Тэлеспектакль «Гадзіннік з зязюляй». 1978 год.

### EuroSport 1

**3.30, 7.00, 9.00, 11.30, 15.00, 17.00, 20.00, 23.00** Горныя лыжы. Кубак свету.
**5.00, 8.00, 10.30, 14.00, 18.30, 22.00, 0.30, 2.30** Скачкі з трампліна. Турнэ 4 трамплінаў.
**6.00, 9.30, 1.30** Біятлон. Калядная гонка.

### Кінакамедыя

**0.35** Камедыя «Як па масле».
**2.15** Камедыя «Забойны футбол».
**4.05, 14.00, 14.50, 15.35, 17.30** Скетчкам «Паміж намі».
**4.25** Камедыя «Лорд Дракон».
**6.15** Камедыя «Два светы».
**8.10** Дэтэктыў «Шарада».
**10.15** Камедыя «СуперБабровы».
**12.00** Камедыя «Паміж анёлам і чортам».
**14.15, 15.05** «Камедыянты (Шоу)».
**16.00** Меладрама «Нерэальнае каханне».
**17.45** Меладрама «Домік у сэрцы».
**19.30** Камедыя «Кулі над Брадвеем».



**21.20** Камедыя «Імя».
**23.20** Камедыя «Дробныя махляры».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.30** «Ёсць адзін сакрэт».
**7.55** «Доктар І...»
**8.25, 19.00, 2.35** «Асколкі». Серыял.
**10.00, 4.30** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**11.45** «Сляпая».
**12.45** «Варажбітка».
**13.50** «Паралельны свет».
**14.50** «Здзелка».
**15.50** «Натуральны адбор».
**16.55, 21.45** «Рэвізора».
**18.00** «Тайны следства». Серыял.
**20.45, 1.45** «Містыка адносін».
**22.50, 4.00** «Вокладка».
**23.25** «Звышнатуральнае». Серыял.



**0.10** «Дзённік Брыджыт Джонс». Камедыя.

### ТБ1000

**6.10, 18.10** Баявік «Солт».
**8.10** Камедыя «Такія розныя блізняты».
**10.10** Драма «Дваццаць адно».
**12.20** Фільм-катастрофа «Пасейдон».
**14.10** Драма «Самы блізкі сябар».
**16.10** М/ф «Прыгоды Цінціна: Тайна Аднарога».
**20.10** Камедыя «Тату зноў 17».
**22.05** Камедыя «Секс у вялікім горадзе 2».
**0.35** Трылер «Экстрасэнс».
**2.20** Трагікамедыя «Пра Шміта».
**4.25** Трылер «Параноя».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Драма «Шык».
**8.20** Камедыя «Пра што яшчэ гавораць мужчыны».
**10.20** Меладрама «Вораг нумар адзін».
**12.20** Фантастыка «Падлеткі ў Сусвеце».
**14.10** Меладрама «Афінскія вечары».
**16.10** Драма «Маскоўскі жыгала».
**18.10** Драма «Анёлы рэвалюцыі».
**20.20** Меладрама «Навагодні рэйс».
**0.10** Дэтэктыў «Хто я?»
**2.10** Камедыя «Свята пад замком».
**4.05** Трылер «Як я праведў гэтым летам».

### National Geographic

**6.00** Гульні розуму.
**6.50, 13.15, 5.35** Навуковыя недарэчнасці.
**7.55, 14.00, 16.20, 19.25, 21.00, 23.20, 0.50, 3.10** Расследаванні авіякатастроф.
**8.40, 11.00, 14.50, 21.45, 1.35, 4.45** Шаша праз пекла.
**9.30, 17.05** Золата Юкана.
**10.15, 17.50** Незвычайныя промыслы.
**11.45, 15.35** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**12.30** Чалавек супраць YouTube.
**18.35, 22.30, 2.20** Марс.
**20.10** 80-я: дзесяцігоддзе, якое стварыла нас.
**0.05** Зона 51: Сакрэтныя файлы ЦРУ.

### Discovery

**8.00, 14.00** На краі Аляскі.
**9.00, 15.30, 21.30, 5.55** Як гэта ўстроена?
**9.30, 15.00, 21.00, 5.30** Як гэта зроблена?
**10.00, 16.00** Бітвы за кантэйнеры.
**10.30, 16.30, 23.30, 7.35** Паляўнічыя на склады.
**11.00** Дарожныя каўбоі.
**12.00, 0.00, 3.50** Залатая ліхаманка.
**13.00** Смяротны ўлоў.
**17.00, 22.00, 2.55** Махінатары.
**18.00** Бітвы робатаў.
**23.00, 7.10** Паляўнічыя на рэліквіі.
**1.00, 4.40** Самагоншчыкі.
**2.00, 6.20** А ты б выжыў?

# ПЕРШАЯ ЛІГА

У канцы лістапада ў Мінску ў РЦАП адбыўся чэмпіянат Беларусі (1-я ліга) па шашках-64 сярод мужчын і жанчын. Турнір з'яўляўся адборачным да чэмпіянату краіны (Вышэйшая ліга), які адбудзецца ў наступным годзе. Па пяць пераможцаў атрымлівалі права выступіць у галоўным турніры года.

У мужчынскім турніры сабраліся 32 шашысты, сярод якіх віцэ-чэмпіён Еўропы, міжнародны гросмайстар Яўген Кандрачэнка (Гомель), які меў персанальнае права гуляць у вышэйшай лізе. Відавочны фаварыт упэўнена выйграў першае месца з вынікам 16 ачкоў з 18 магчымых, атрымаўшы перамогі ў 7 матчах. Другім фінішаваў майстар Віталь Аніська (Мінск) — 13 ачкоў. 3—4-е месцы падзялілі майстар Віталь Новікаў (Віцебск) і міжнародны гросмайстар па шашках-100 Сяргей Насевіч (Мінск). У іх па 12 ачкоў. Шэсць удзельнікаў набралі па 11 ачкоў, падзяліўшы 5—10-е месцы. Лепшы каэфіцыент аддаў дзве астатнія пуцёўкі ў вышэйшую лігу міжнароднаму майстру Анастасіі Барышавай (Мінск) і майстру Раману Протчанку (Гомель). У жаночым чэмпіянаце, у якім гулялі 22 шашысткі, упэўнена перамаглі майстры спорту Паліна Петрусева і Аляксандра Спірына (абедзве: Мінск) — 15 ачкоў з 18 магчымых. Яшчэ тры пуцёўкі заваявалі Лізавета Дагіль (Ліда) і кандыдат у майстры Вікторыя Мікалаева. У іх па 12 ачкоў. Пятую пуцёўку атрымала Дар'я Нікіфарава — 11 ачкоў.

З 10 па 18 снежня 2016 г. у Санкт-Пецярбургу (Расія) прайшоў фінал Кубка свету 2016 года — Міжнародныя спаборніцтвы па шашках-64 памяці В.А. Сокава. Спаборніцтва праводзілася ў дзвюх праграмах — асноўная і вокамгненная. У асноўнай прынялі ўдзел 60 шашыстаў, з якіх дзевяць міжнародных гросмайстраў. Прадстаўнікі нашай краіны паказалі добрыя вынікі. У асноўным турніры міжнародны майстар Міхаіл Семянюк заваяваў сярэбраны медаль з вынікам 13 ачкоў з 18 магчымых. 11 ачкоў і 15-е месца ў мінчанкі Яны Лазовік, што дазволіла ёй у жаночым заліку паднясца на другую прыступку п'едэстала гонару. Яшчэ адна юная мінчанка, кандыдат у майстры Вікторыя Мікалаева, заваявала першае месца ў жаночым заліку ў бліц-праграме.

*Пагледзіце цікавыя моманты.*

**№42** З. Шыбакоў —В. Варушыла

**Белыя простыя шашкі:** a1, c1, c3, d2, d4, e1, e3, f4, h2, h4, h6 (11)

**Чорныя простыя шашкі:** a3, a5, a7, b6, d6, d8, e7, f6, f8, h7, h8 (11)

Чорныя пераходзяць да вырашальных дзеянняў 1...fe5 2.df6 eg5! 3.hf6 gg3 4.hf4 hg7, белыя сціснутыя ў выбары 5.ed4 (5.cd4? нельга-за fe7, ef4, hg3 +) gf6 і ў далейшым чорныя рэалізавалі сваю перавагу. Цікавая камбінацыя была магчыма пасля 5.ab2 gf6 6.ef2 fg5 7.cd4 de5 (выйграе і больш празаічнае 7 ... bc5 8.db6 ac5 +) 8.fd6 (8.dh4 fg7 9.hf8 bc5 +) gf4 9.eg5 fe7 10. df8 gf4 +

**№43** В. Скрабаў — Ю. Пракапенка

**Белыя простыя шашкі:** c1, e3, g1, h2, белыя дамкі a5 (5)

**Чорныя простыя шашкі:** a3, f8, h4, чорныя дамкі a1 (4)

Белыя перамаглі з дапамогай пікантнага фіналу. Паспрабуйце адшукаць манеўр самастойна. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

**№42**



**Праверце свае рашэнні:** Выпуск №26 ад 09.12.16.

**№39** 8.ed4? dc5! X

**№40** 10.fe3!! 10...h:d4 11.ef2! f:h4 12.fg3 h:f2 13.g:c5 b:d4 14..de3 d:f2 16.cb4 a:c3 17.b:g1 =

**№41** 1. fg5x

Дакладныя адказы даслалі П. Аніканаў (Шчучын), А. Шурпін (Клімавічы) І. Ананіч (Гродна), В. Талкачоў (Клімавіцкі р-н), В. Ваўчкоў (Маладзечна), В. Бандарык (Мінскі р-н), А. Ліцвінаў, П. і В. Шульга (Мінск).

*Пішыце на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, газета «Звязда». e-mail: info@zviazda.by, або vorush@yandex.ru*

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**

## Пятніца, 30 снежня

### Беларусь 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 1.50 Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 19.20 Зона Х.
**9.10 Меладрама «Халодная страва». 2-я серыя.**
10.00, 13.00, 16.00 90 секунд.
**11.00, 20.00 Серыял «Жаночы доктар-2».**
**12.10, 17.40 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».**
13.20 Дзень у вялікім горадзе.
14.20 Дзіцячы доктар.
15.15, 18.40 Навіны рэгіёна.
**15.25 Серыял «І шарык вярнецца».**
21.00 Панарама.
21.45 Спецыяльны рэпартаж.
**22.05 Камедыя «Навагодні рэйс». 1—4-я серыі.**
2.05 Дзень спорту.

### Беларусь 2

7.00 Тэлераніца.
9.00, 22.35 Тэлебарометр.
**9.05, 18.00 Серыял «Кухня».**
**10.15, 17.05 Дэтэктыў «Такая работа».**
11.05 Рэпарцёр.
**12.10, 16.05 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».**
13.10, 19.10 «Багіня шопінгу». Фэшн-шоу.
14.15 «Арол і рэшка. Шопінг». Трэвел-шоу.
15.20 «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
20.10, 22.05 Прыгоды «Захавальнік часу».
22.00 Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**22.40 Вестэрн «Джанга вызвалены».**

### Беларусь 3

7.00 «Дабранакк».
7.35 «Беларуская кухня». Бульбяная каша з ража́нкай.
8.00, 12.40, 21.05 «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20 «Дванаццаць месяцаў». Казка.**
10.35, 16.30 «Міс Мядзведзіца». Прыгоды.
12.10 «Сіла веры».
12.55 «Навукаманія».
13.20 Юбілейны канцэрт фальклорнага гурта «Купалінка».
**14.30 «Снежная каралева». Казка.**
15.50 «Навагодні тыдзень». Сольны канцэрт Ядзвігі Паплаўскай і Аляксандра Ціхановіча.
18.05 «Камертон». Кампазітар, фалькларыст, лідар гурта «Троіца» Іван Кірчук.
18.30 М/ф.
19.10 «Пацалунак Сакрата». Дэтэктыў. «Тайна залатых апосталаў». 2-я серыя, заключная.
20.00 «Навагодні тыдзень». Сольны канцэрт Ядзвігі Паплаўскай і Аляксандра Ціхановіча.
20.40 «Калыханка».
**21.20 «Карнавал». Меладрама.**
23.55 Канцэрт групы «Nickelback».

### Беларусь 5

8.00, 19.15, 22.00 PRO спорт. Навіны.
8.10 Фактар сілы.
8.35, 13.00 Хакей. Кубак Шпенглера. Плэй-оф.
10.30 Хакей. КХЛ. СКА (Санкт-Пецярбург) — «Лакаматыў» (Яраслаўль).
12.30 «Два бакі алімпійскага медаля». Марыя Мамашук.
15.00 «На шляху да ЧС-2018». Відэачасопіс.
15.30 «Жанчыны і спорт». Марына Арзамасава.
16.00 Танцавальны спорт. Міжнародны турнір.
16.55, 22.10 Хакей. Кубак Шпенглера. 1/2 фіналу.
19.25 Баскетбол. Еўраліга. УНІКС (Расія) — «Панацінаікас» (Грэцыя).
21.25 Піт-стоп.

### АНТ

6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00 (з субцітрамі), 8.30, 9.00 (з субцітрамі), 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 (з субцітрамі), 20.30 Нашы навіны.
6.05, 8.05 «Наша раніца».
9.05 «Жыць здорава!»
10.25 «Кантрольная закупка».
11.05, 13.05, 16.15, 18.15 (з субцітрамі), 21.00 Навіны спорту.
11.10 «Модны прыгавор».
12.20 «Адваротны адлік». «Два жыцці Надзеі Грэкавай».
13.10 «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10 Камедыя «Гэта вясёлая планета».**
**16.20, 18.20 Серыял «Скарлет».**
18.35 «Поле цудаў». Навагодні выпуск.
20.00 Час.
21.05 «Клуб Вясёлых і Знаходлівых». Вышэйшая ліга. Фінал.
23.20 «Што? Дзе? Калі?» Зімовая серыя гульняў. Фінал.
1.00 Начныя навіны.

### СТБ

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.25 «Міншчына».
6.20, 7.45 «Раніца. Студыя добрага настрою».
7.40, 20.10, 23.00 «СТБ-спорт».
8.30 «Тайны Чапман».
9.30, 18.35 «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
10.40 «Сямейныя драмы».
11.40 «Не хлусі мне!»
12.35, 17.35 «Званая вячэра».
13.50 «Дзіўная справа».
**15.35 «Следакі». Серыял.**
16.50 «Аўтапанарама».
17.10 «Шчырая размова».
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15 Фантастыка «Бяссмертныя».**
21.55 «Глядзець усім!»
**23.05 Камедыя «Дрэнны Санта».**
0.40 «Зорны рынг. Навагодняя бітва хітоў «Назад у 90-я!»
1.40 Дакументальны праект: «Адваротны бок Новага года».

### МІР

6.00 М/ф.
7.00 «Такія дзіўныя».
7.30 Добрай раніцы, свет!
**9.00 Маст. фільм «Папялушка».**
**10.30 Маст. фільм «Сірата казанская».**
12.30 «Цяжар абеду».
13.00, 16.00, 19.00 Навіны (бягучы радок).
13.10 Даеш Новы год!
**14.30, 5.10 Маст. фільм «Адзінокім даецца інтэрнат».**
**16.15 Маст. фільм «Дванаццаць крэслаў».**
**19.20 Мюзікл «Марозка».**
**21.20 Мюзікл «Чырвоная Шапачка».**
**23.25 Маст. фільм «Дванаццаць крэслаў».**
**2.20 Серыял «Канькі для чэмпіёнкі».**

### РТР—Беларусь

7.00 «Раніца Расіі».
11.00, 14.00, 20.00 Весткі.
11.35 «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
12.00 «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
13.10 «Правілы жыцця».
13.50, 16.50, 19.50, 22.50 Навіны — Беларусь.
**14.20, 17.00 Маст. фільм «Клубнічны рай».**
**18.25, 20.40 Маст. фільм «Яблычны спас».**
**23.00 Маст. фільм «Снег на галаву».**
0.40 «Фінал Міжнароднай лігі КВЗ».

### НТБ—Беларусь

5.55 «Астрапрагноз».
6.00 «Новая раніца».
7.25 «Студыя Юліі Высоцкай».
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
**8.10 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.20 Серыял «Ляснік».**
12.00 Суд прысяжных.
13.25 Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05 Серыял «Хвост».**
**16.25 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
18.05 «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
19.45 «Ты не паверыш!» Навагодні выпуск.
**20.35 Баявік «Траса».**
0.00 «НЗ.by».
0.20 «Распуцін. Расследаванне».

### 8 канал

7.00 Раніца на «Восьмым».
**11.00 Меладрама «Каханне і галубы».**
**12.50 Камедыя «Іронія лёсу, або З лёгкай парай!»**
16.00, 19.20, 21.00, 23.55 «Надвор'е».
16.05 «Мультпарад». «Па шчупаковым загадзе».
16.40 «Адшукваецца адпачынак».
17.10 «Хатняя крама».
**17.40 Серыял «Вікторыя».**
**18.35 Серыял «Падмані мяне».**
**19.25 Серыял «Флэш».**
20.50 «Вечарніца».
**21.05 Камедыя «Паляўнічыя на прывідаў».**
23.25 «Падаў леташні снег».

### ВТБ

6.00 «Турбаміксер».
7.00, 18.00 Серыял «Варонiны».
8.00 «Ералаш».
8.20 М/ф «Смяшарыкі».
8.50 М/ф «Фіксікі».
9.20 М/ф «Маша і мядзведзь».
9.40 Камедыя «Ёлкі 1914».
11.40, 14.40 Серыял «Гатэль «Элеон».
12.50 «Паспець за 24 гадзіны».
14.00, 4.00 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
15.50, 19.10 Серыял «Вечны водпуск».
20.20, 1.30 «Уральскія пельмені».
22.10 Камедыя «Ёлкі лахматыя».
0.00 Камедыя «Рэальныя ваўкалакі».
2.40 Скетч-шоу «6 кадраў».
3.00 «Лаві момант».
3.30 Скетчкам «Студэнты».
4.30 «Мільёны ў сетцы».
5.00 Скетч-шоу «Валера ТБ».

### Культура

6.30 «Еўраньюс».
10.00, 15.00, 19.00, 0.15 Навіны культуры.
10.20 «Кінагерой. Стагоддзе рускай містыфікацыі». Дак. фільм.
11.15, 20.50 «Папялушка-80». Маст. фільм. 3—4-я серыі.
12.50 «Ёган Кеплер». Дак. фільм.
13.00 «Пешшу...» Масква ўзорыстая.
13.30 Успамінаючы Эрнста Неізвеснага. «Даволі вядомы Неізвесны».
14.10 Па слядах тайны. «Чалавек эпохі дыназаўраў».
15.10 Канікулы! «У пошуках капітана Гранта». Маст. фільм.
16.25 «Станіслаў Гаварухін. Маналогі кінарэжысёра». Дак. фільм.
17.20 Міжнародны музычны фестывалі. Лондан. Джойс ДзіДаната, Найджэл Кенэдзі, сімфанічны аркестр і хор тэлерадыёкампаніі ВВС.
18.55 Сусветныя скарбы.
19.10 «Добрай ночы, малыя!»
19.45 Галоўная роля.
20.05 «Уладзімір Співакоў. Дыялогі з Саламонам Волкавым». Дак. серыял.
22.30 Вольга Перацацька, Ганна Нятрэбка, Ільдар Абдразакаў, Юсіф Эйвазаў, Басіль Ладзюк у гала-канцэрце на Дварцовай плошчы Санкт-Пецярбурга.
0.30 Каралеўскае кіно. «Марыя-Антуанета. Сапраўдная гісторыя». Маст. фільм.
1.55 Міжнародны фестываль цырка ў Монтэ-Карла.

### Настальгія

6.00 «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар. 2008 год.
7.00 Фільм-спектакль «Таблетку пад язык». 1978 год.
8.30, 9.40, 11.00, 12.50, 15.40, 17.00, 21.40, 2.50, 3.40, 5.00 Музычная настальгія.
9.00, 15.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час».
10.00, 16.00, 4.00 «Народжаныя ў СССР».
12.00 «Эліта Краіны Саветаў». Анатоль Лук'янаў. 2007 год.
13.05 «КВЗ — 87-88». МДУ — ДДУ — НДУ. Фінал.
18.00 «Да і пасля паўночы» з Уладзімірам Малчанавым. 1988 год.
20.00 Тэлеспектакль «Джэнтльмены, якім не пашанцавала». 1977 год.
22.00 «Колба часу».
23.00 «Песня-80». 1-е аддзяленне.
0.00 «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Пачатак перабудовы: «сухі» закон». 2006 год.
0.50 Фільм-спектакль «Пена». 1977 год.

### EuroSport 1

3.30, 6.00, 9.00, 12.45, 15.45, 23.30, 1.30 Горныя лыжы. Кубак свету.
4.00, 7.00, 11.45, 20.45 Біятлон. Калядная гонка.
5.00, 8.00, 10.30, 14.30, 17.15, 22.00, 0.30, 2.30 Скачкі з трампліна. Турнэ 4 трамплінаў.

### Кінакамедыя

1.00 Драма «Вундэркінды».
3.00 Камедыя «Газелі».
4.50 Камедыя «Няхай жыве Францыя!»
6.40 Камедыя «Дзікая штучка».
8.30 Меладрама «Гуляй, як Бэкхэм».
10.30 Меладрама «Вясельны разгром».
12.20 Камедыя «Вялікае вяселле».
14.00, 14.50, 15.35 Скетчкам «Паміж намі».
14.15, 15.05 «Камедыянты (Шоу)».
16.00 Меладрама «Адчыніце, Дзед Мароз».
17.55 Камедыя «Крымінальныя абставіны».
19.30 Камедыя «Блізня».
21.30 Камедыя «Джым з Пікадзілі».
23.15 Дэтэктыў «Шарада».

### ТБ3

6.00 М/ф.
7.35 «Ёсць адзін сакрэт».
8.00 «Доктар І...»
8.30 «Асколкі». Серыял.
10.00, 4.05 «Судовыя страсці». Дак. серыял.
11.45 «Сляпая».
12.45 «Варажбітка».
13.50 «Паралельны свет».
14.55 «Здзелка».
15.55 «Людзі пятніцы».
16.55 «Рэвізора».
18.00, 5.35 «Рыжыя».
19.00, 2.30 «Добры дзень, я ваша Пятніца».
21.00 «Брыджыт Джонс: межы разумнага». Камедыя.
23.00 «Гучныя справы».
0.00 «Каліфрэнія». Серыял.
0.30 «Моцны арэшак 2». Баявік.

### ТБ1000

6.10, 18.10 Мюзікл «Лак для валасоў».
8.10 Камедыя «Секс у вялікім горадзе 2».
10.40 Трылер «Экстрасэнс».
12.30 Камедыя «Тату зноў 17».
14.20 Трагікамедыя «Пра Шміта».
16.30 Фантастыка «Пазаземная рэха».
20.10 Камедыя «Упраўленне гневам».
22.05 Меладрама «Трэцяя персона».
0.20 Драма «Спакуса».
2.15 Драма «Бачнасць гневу».
4.10 Меладрама «Прабач за каханне».

### ТБ1000 Рускае кіно

6.20 Меладрама «Навагодні рэйс».
10.20 Дэтэктыў «Хто я?»
12.20 Казка «Старая, старая казка».
14.20 Камедыя «Свята пад замком».
16.10 Трылер «Як я правёў гэтым летам».
18.25 Меладрама «Платон».
20.20 Камедыя «Мамы 3».
22.10 Камедыя «Мужчына з гарантыяй».
0.00 Меладрама «Статус: свабодны».
1.45 Камедыя «Заказ на адНаго».
3.00 Камедыя «Выкрутасы».
4.40 Трылер «Халодны фронт».

### National Geographic

6.00 Гульні розуму.
6.50, 13.00, 5.35 Навуковыя недарэчнасці.
7.35, 13.45, 18.30, 20.50, 0.50, 4.00 Марс.
9.10, 16.10, 19.15, 23.15, 3.20 Расследаванні авіякатастроф.
9.55, 17.40 Шаша праз пекла.
11.30 15.25 Міжнародны аэрапорт Дубай.
12.15 Чалавек супраць YouTube.
20.05 80-я: дзесяцігоддзе, якое стварыла нас.
0.05 Лініі Наска: расшыфравана.

### Discovery

8.00, 12.00 На краі Аляскі.
9.00, 15.30, 21.30, 5.55 Як гэта ўстроена?
9.30, 15.00, 21.00, 5.30 Як гэта зроблена?
10.00, 16.00, 23.00, 7.10 Паляўнічыя на рэліквіі.
10.30, 16.30, 23.30, 7.35 Паляўнічыя на склады.
11.00 Аляска: апошні рубеж.
13.00, 1.00 Гарады жывыя і мёртвыя.
14.00 Траса Калыма.
17.00, 22.00, 2.55 Махінатары.
18.00 Рэальныя дальнабойшчыкі.
20.00 Тэхнагеніка.
0.00, 3.50 Залатая ліхаманка.
2.00, 6.20 А ты б выжыў?
4.40 Самагоншчыкі.

## Субота, 31 снежня

### Беларусь 1

**6.20, 9.50, 12.10, 15.10, 18.00, 21.35 Серыял «Сваты-6».**
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10, 11.20, 14.25, 17.25, 20.25** «Беларусь сустракае Новы год». Тэлемарафон.
**21.00** Панарама.
**22.45** «Беларусь сустракае Новы год». Канцэрт.
**23.50** Навагодняе віншаванне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі.
**0.05 Камедыя «Невідзімкі».**
**1.35 Камедыя «СуперБабровы».**
**3.10 Камедыя «Найлепшы дзень».**
**4.50 Серыял «Сваты-6».**

### Беларусь 2

**7.05** М/с «Сябры анёлаў».
**7.35 Фільм для дзяцей «Зорныя талеры».**
**8.35, 20.05** Тэлебарометр.
**8.40** «Арол і рэшка. Шопінг». Трэвел-шоу.
**9.45 Прыгоды «Захавальнік часу».**
**11.55** Капейка ў капейку.
**12.35** Два рублі.
**12.55** «Паненка-сялянка». Рэаліці-шоу.
**14.05** «Каханне анлайн». Рэаліці-шоу.
**15.20** «Ікона стылю». Фэшн-шоу.
**16.40** Анімацыйны фільм «Сакрэтная служба Санты Клаўса».
**18.25 Камедыя «Ёлкі лахматыя».**
**20.00** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**20.10 Камедыя «Ёлкі».**
**21.55 Камедыя «Ёлкі 2».**
**23.50** Навагодняе віншаванне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі.
**0.05 Камедыя «Ёлкі 3».**
**1.40 Фантастыка «Трансформеры».**
**3.50 Фантастыка «Трансформеры. Помста паўшых».**

### Беларусь 3

**7.35** «Беларуская кухня». Качка, запечаная з капустай.
**8.05, 12.35, 21.05** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20 «Оскар». Камедыя.**
**9.40 «Снежная каралева». Казка.**
**11.05** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**11.40** «Навукаманія».
**12.05** «Наперад у мінулае».
**12.55, 1.25 «Карнавальная ноч-2, або Праз 50 год». Камедыя.**
**15.05 «Карнавал». Меладрама.**
**17.40** Аўтарскі канцэрт паэта-песенніка Алега Жукава.
**19.15, 3.40 «Зігзаг удачы». Камедыя.**
**20.40** «Калыханка».
**21.20 «Чарадзеі». Камедыя.**
**23.50** Навагодняе віншаванне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі.
**0.05** «Песні для душы». Канцэрт.
**5.00 «Вяселле ў Малінаўцы». Камедыя.**
**6.35** «Дзікія лебедзі». М/ф.

### Беларусь 5

**8.00, 18.15** PRO спорт. Навіны.
**8.10** Танцавальны спорт. Міжнародны турнір.
**9.05** «Гукі лета. Успамінаючы Еўра-2016».
**10.00, 11.55** Хакей. Кубак Шпенглера. 1/2 фіналу.
**13.55** Хакей. Кубак Шпенглера. Фінал.
**16.25** Мастацкая гімнастыка. Baby Cup.
**18.25** Зорныя імгненні — 2016.
**18.55** Накаўт-раўнд. Конкурс каментатараў.
**19.25** PRO спорт. Вынікі года.
**20.20** «Жанчыны і спорт».
**20.50** «Альянс кап — 2016». Танцавальны спорт.
**22.55** Нашы перамогі — 2016.
**23.20** Нашы перамогі. Рыа-2016.
**23.50** Навагодняе віншаванне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі.
**0.05** Танцавальны спорт. Зорнае шоу.

### АНТ

**7.00, 8.05** «Суботняя раніца».
**8.00, 9.00** (з субцітрамі), **16.00** (з субцітрамі), **20.00** Нашы навіны.
**9.05** «Навагодні каляндар».
**10.20** «31 снежня. Навагоднее шоу».
**11.50 Камедыя «Джэнтльмены ўдачы».**
**13.20** «Удача ў прыдачу! з «Еўраопт».
**14.05** «Песня года Беларусі — 2016». Частка 1.
**16.15 Камедыя «Сабака Барбос і незвычайны крос».**
**16.30 Камедыя «Іронія лёсу, або З лёгкай парай!»**



**20.30** «Голас». Фінал.
**22.45, 0.05** «Навагодняя ноч».
**23.50** Навагодняе віншаванне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнкі.
**2.05** «Легенды «Рэтра FM».
**4.10** «Я какаю цябе».

### СТБ

**6.25** Дакументальны праект: «Адваротны бок Новага года».
**7.10 Фантастыка «Бясcмяротныя».**
**8.40 Фільм — дзецям «Прыгоды Бураціна».**
**11.00** «Мінск і мінчане». Святочны выпуск.
**11.35** Музычнае шоу «Дзве зоркі на СТБ». Новы сезон. Рэдкія кадры.
**13.30, 16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**13.45** «Шчырая размова».
**14.00 Маст. фільм «Па сямейных абставінах».**
**16.45** «Вялікі горад».
**17.30** «Мінск-2016».
**18.10** Суперфінал музычнага шоу «Дзве зоркі на СТБ». Новы сезон. Рэдкія кадры.
**20.00 Камедыя «Чарадзеі».**
**22.45, 0.05** «12 цудаў у навагоднюю ноч».
**23.50** Навагодняе віншаванне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі.
**2.30** «Легенды Рэтра-FM».

### МІР

**6.50** М/ф.
**7.10 Маст. фільм «Навагодні прыгоды Машы і Віці».**
**8.20 Маст. фільм «Папялушка».**
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15, 16.10, 3.15** Фестываль Аўтарадыё «Дыскатэка 80-х».
**14.00, 1.25** Усе хіты Гумару.
**23.20** Танцуюць усе!

### РТР—Беларусь

**7.00** «Пакой смеху».
**8.10 Камедыя «Чарадзеі».**
**11.10 Маст. фільм «Карнавал».**
**14.00** Весткі.
**14.25** «Найлепшыя песні». Святочны канцэрт.
**16.15 Маст. фільм «Завіруха».**
**18.00 Камедыя «Паласаты рэйс».**
**19.40** «Каралі смеху».
**21.50** «Навагодні парад зорак».
**23.50** Навагодняе віншаванне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі.
**0.05** Навагодні Блакітны агеньчык — 2017.
**4.20 Камедыя «Прывітанне, я ваша цётка!»**

### НТБ—Беларусь

**5.40** «Астрапрагноз».
**5.45, 8.20 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**8.00, 10.00, 14.00** Сёння.
**8.45, 10.25 Серыял «Траса».**
**12.30** «Ежа жывая і мёртвая». Навагодні выпуск.
**13.20** «Удача ў прыдачу!»
**14.20** «Усе зоркі ў Новы год».
**16.05 Меладрама «Мая мама Снягурачка».**
**17.35 Камедыі «Свята пад замком».**
**19.00** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**20.00** «Навагодні мільярд».
**22.35, 0.05** «Жывы Новы год».
**23.50** Навагодняе віншаванне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі.
**0.55** Фестываль Аўтарадыё «Дыскатэка 80-х».

### 8 канал

**9.00, 16.05, 18.45, 20.55, 23.55** «Надвор'е».
**9.05** М/ф «Ну, пачакай!»
**9.15** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**9.25 Камедыя «Пра беднага гусара закіньце слова».**
**12.15 Камедыя «Гусарская балада».**
**13.50** «Глядзім усёй сям'ёй». М/ф «12 месяцаў».
**14.45** М/ф «Снежная каралева».
**16.10** «Адшукваецца адпачынак».
**16.40** «Хатняя крама».
**17.00, 18.50 Камедыя «Навагодні рэйс», 1—4-я серыі.**
**20.35** «Вечарніца».
**20.45** «Фэшн is my прафэшн».
**21.05 Камедыя «Краіна цудаў».**
**22.30 Камедыя «Усё збудзецца».**

### ВТБ

**6.00** Меладрама «Зменлівасці кахання».
**7.40** М/ф «Смяшарыкі».
**8.10** М/ф «Фіксікі».
**8.30** М/ф «Машыны казкі».
**8.55** М/ф «Машкіны страшылкі».
**9.00** «Ералаш».
**10.00** «Паспець за 24 гадзіны».
**11.00** «Турбаміксер».
**13.00** Камедыя «Каўказская палонная!»
**15.10** Анімацыйны фільм «Снежная каралева».
**16.50** Камедыя «Джэнтльмены, удачы!»
**19.00** Трэвел-шоу «Смачная планета». Навагодні выпуск.
**20.30** «Уральскія пельмені». Ёлачка, бяжы!
**22.30** «Уральскія пельмені». Пакамечаны студзень.
**1.00** «Уральскія пельмені». Калі насы ў 12 б'юць.
**2.30** «Уральскія пельмені». Снегу і відовішчаў.
**4.30** «Уральскія пельмені». Барада змятая.

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00** «Утаймаванне свавольнай». Маст. фільм.
**11.25** «Больш, чым каханне». Людміла Касаткіна і Сяргей Коласаў.
**12.10** Кубанскі казацкі хор у канцэрце «Казакі Расійскай імперыі».
**13.30** Міжнародны фестываль цырка ў Монтэ-Карла.
**14.30** Да 80-годдзя з дня нараджэння Эдуарда Марцэвіча. «Ідэальны муж». Маст. фільм.
**16.05** «Чаму смяецеся? або Класікі жанру».
**16.40** Джо Дасэн. Канцэрт у «Алімпіі».
**17.40** «Сіняя птушка». Усерасійскі адкрыты тэлевізійны конкурс юных талентаў. Фінал.
**21.05** «Формула кахання». Маст. фільм.
**22.40, 0.00** Новы год на канале «Культура» з Уладзімірам Співаковым.
**23.55** Навагодні зварот Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі У.У. Пуціна.
**1.30** Джо Дасэн. Канцэрт у «Алімпіі».
**2.25** «Падаў леташні снег». «Хто раскажа байку?» Мультфільмы для дарослых.

### Настальгія

**6.00** «Эліта Краіны Саветаў». Анатоль Лук'янаў. 2007 год.
**6.50, 9.40, 11.00, 15.40, 20.25, 3.40, 5.00** Музычная настальгія.
**7.05** «КВЗ — 87-88». МДУ — ДДУ — НДУ. Фінал.
**9.00, 15.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**12.00** «Да і пасля паўночы» з Уладзімірам Малчанавым. 1988 год.
**14.00** Тэлеспектакль «Джэнтльмены, якім не пашанцавала». 1977 год.
**16.00** «Колба часу».
**17.00** «Песня-80». 1-е аддзяленне.
**18.00** Маст. фільм «Чарадзеі».



**21.00** «Быў час». 2008 год.
**22.00** «А трынаццатай гадзіне ночы». Фільм-канцэрт пра сустрэчу Новага 1970 года. 1969 год.
**23.10** Навагодняя музычная настальгія.

### EuroSport 1

**3.30, 9.00** Біятлон. Калядная гонка.



**4.30, 6.00, 10.00, 13.00** Горныя лыжы. Кубак свету.
**5.00, 8.00, 10.30, 14.15, 18.30, 20.00, 22.00, 0.30, 2.30** Скачкі з трампліна. Турнэ 4 трамплінаў.
**12.00** Конны спорт. Кубак свету.
**17.15, 21.00, 23.15, 1.30** Лыжныя гонкі. «Тур дэ Скі».

### Кінакамедыя

**1.15** Камедыя «Паміж анёлам і чортам».
**3.15** Камедыя «Лорд Дракон».
**5.05** Камедыя «Як па масле».
**6.50** Меладрама «Нерэальнае каханне».
**8.25** Камедыя «Месяцавая афера».
**10.10** Камедыя «Кулі над Брадвеем».
**12.00** Драма «Вундэркінды».
**14.00** Камедыя «Блізня».
**16.00** Камедыя «Дзікая штучка».
**17.50** Меладрама «Вясельны разгром».
**19.45** Камедыя «Настаўнік года».
**21.50** Камедыя «СуперБабровы».
**23.35** Камедыя «Забойны футбол».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**9.45** «Вечары на хутары паблізу Дзіканькі».
**10.55** «Новы год з дастаўкай на дом».
**12.50** «Мужчына ў маёй галаве». Камедыя.
**15.00** «Палярны экспрэс». Анімацыйны фільм.
**16.45, 4.35** «Федзька». Камедыя.
**18.25** «Адзін дома». Камедыя.
**20.30** «Адзін дома 2». Камедыя.
**22.40** «Адзін дома 3». Камедыя.
**0.30** «Спяваем разам любімыя песні».
**3.20** «Карнавальная ноч». Камедыя.

### ТБ1000

**6.10** Драма «Развітальны квартэт».
**8.00** Меладрама «Трэцяя персона».
**10.15** Драма «Спакуса».
**12.15** Камедыя «Упраўленне гневам».
**14.05** Меладрама «Прабач за каханне».
**16.05** Фэнтэзі «Залаты компас».
**18.00** Меладрама «Іспанская-англійская».
**20.10** Камедыя «Сем'янін».
**22.20** Камедыя «Няпрошаныя госці».
**0.30** Драма «Вялікія вочы».
**2.30** Трылер «Каматознікі».
**4.35** Камедыя «Такія розныя блізняты».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20, 16.20, 0.25** Камедыя «Ёлкі».
**8.15, 18.15, 2.05** Камедыя «Ёлкі 2».



**10.20, 20.20, 4.20** Камедыя «Ёлкі 3».
**12.20** Камедыя «Ёлкі лахматыя».
**14.10, 22.20** Камедыя «Ёлкі 1914».

### National Geographic

**6.00, 19.45, 22.30, 0.00, 1.10, 2.40, 3.55, 4.45, 5.35** Гульні розуму.
**6.45** Навуковыя недарэчнасці.
**7.30, 10.45, 12.25** Дзікая прырода Расіі.
**14.00, 15.40, 18.05** Марс.

### Discovery

**8.00** Выжыць пасля сэлфі.
**9.00** Паляўнічыя на склады.
**10.00** Гарады жывыя і мёртвыя.
**11.00, 23.00** У пошуках скарбаў.
**12.00** Выжыць разам.
**13.00, 1.00** Выжыванне без купюр.
**14.00, 22.00** Аляска: апошні рубеж.
**15.00** На краі Аляскі.
**16.00, 21.00** Як уладкаваны Сусвет.
**17.00** Тэхнагеніка.
**18.00, 7.10** Калекцыянеры аўта.
**19.00, 0.00** Аўтальянцы.
**20.00** Вулічныя гонкі.
**2.00** Дзікая кухня.
**4.40** Мяцежны гараж.

## Zамор'е

## ГІРЛЯНДА... АД ЗЛОДЗЕЯЎ

**У навагоднія святы колькасць крадзяжоў рэзка вырастае, таму што пакуль людзі наведваюць сваякоў і забаўляюцца, іх пустыя дамы і кватэры становяцца мішэнню для злодзеяў. Хопіць гэта трываць! Бо цяпер ёсць новая гірлянда, якая здольная адпужваць няпрошаных гасцей.**



Прынцып работы навагодняй гірлянды Christmas Spotlights даволі просты: яна абсталявана датчыкамі руху, якія рэагуюць на набліжэнне чалавека і запальваюць лямпачкі на поўную магутнасць. Іх сумарная яркасць дасягае асляпляльных 12 тысяч люмен, што эквівалентна пары магутных праектараў для дамашняга кінатэатра. Як толькі зламыснікі ў паніцы ўцякуць прэч, ратуючыся ад выпальваючага сятчатку зыркага святла, лямпачкі вернуць сваю ранейшую яркасць, перайшоўшы ў рэжым чакання. І гэта выдатная ідэя, каб павысіць бяспеку дома падчас вашай адсутнасці! Больш за тое, «Калядныя ліхтарыкі» ўмеюць адпраўляць апавяшчэнне на смартфон гаспадара, як толькі спрацуе датчык руху. Шкада, што гірлянда пакуль даступная толькі на сваім мясцовым рынку — у Даніі.

## ЛАСІ ЦІКАВЯЦЦА МАШЫНАМІ

**Дарожна-патрульныя службы Канады рассылаюць аўтааматарам рэкамендацыі не раздражняць ласёў.**



Зараз у краіне снежная зіма, галалёд, і дарожныя службы выкарыстоўваюць соль. А ласі любяць соль і таму ліжуць аўтамабілі, пакрытыя салёным налётам. Спецыялісты заклікаюць не перашкаджаць жывёлам і не спрабаваць адагнаць іх. Эксперты падкрэсліваюць, што вага дарослай жывёлы перавышае 450 кілаграмаў, і таму нешта зрабіць з сахатым чалавеку не ўяўляецца магчымым. Пры гэтым калі лось вырашыць, што яму пагражае ад чалавека небяспека, то можа накінуцца і на яго, і на машыну.

## МІЛЬЁН ДОЛАРАЎ З-ЗА ПАМЫЛКІ

**Жыхар амерыканскага горада Лейквуд (штат Нью-Джэрсі) выйграў у латарэю мільён долараў з-за памылкі прадаўца, паведамляе Time.**




Пераможца латарэі, 70-гадовы Дантэ Касцілья, звычайна сам выбіраў нумары, якія ўказваў у латарэйным білеце. Аднак у апошні раз прадавец выдаў яму білет з ужо прастаўленымі лічбамі, камбінацыя якіх была выпадкова згенераваная камп'ютарам. Менавіта гэта спалучэнне лічбаў, як высветлілася крыху пазней, і прывяло да поспеху. Паводле ўмоў розыгрышу, уладальнік можа забраць усю суму адначасова або штогадовы атрымліваць па тысячы долараў. Касцілья выбраў першы варыянт. Уладальнік крамы, дзе быў рэалізаваны шчаслівы білет, таксама атрымае ўзнагароду — 10 тысяч — ад арганізатараў латарэі.

**Іван КУПАРВАС.** *hvir@zviazda.by*




## ДЗЕД, АЛЕ НЕ МАРОЗ

Даўно гэта было, нават вельмі даўно. Я тады ў Дзеда Мароза верыў, хоць ніколі яго не бачыў. (Хутка, дарэчы, магу зноў паверыць, бо вельмі ж падарункаў хочацца...)

Дык было мне, значыць, гадкі чатыры, і ў гарачы летні дзень я стаяў у сенцах. Стаяў ды разважаў, што б мне зрабіць: пайсці на вуліцу, дзе нікога не відаць, ці знайсці забаўку ў кладоўцы, дзе столькі цікавых рэчаў?

Я так паглыбіўся ў свае разважанні, што нічога не чуў. А потым павярнуўся тварам да расчыненых дзвярэй, глянуў на двор і аслупянеў. Там стаяў... Дзед Мароз. Ён самы! Жывы! Без ніякіх сумненняў, бо з вялікай барадой, з вусамі, у доўгай, амаль да зямлі, світцы, з чароўным кіем...

З таго дзіва (ці жаху?) я не мог скрануцца з месца і толькі праз якую хвіліну на ўсю моц закрычаў:

— А-а-а-а... Дзед Мароз!

Дзед з той неспадзеўкі выпусціў з рук палку. З хаты ледзьве жывая ад страху выскачыла цётка, якую пакінулі, каб мяне глядзела.

І вось тут ужо высветлілася, што госць быў зусім не дзед і не Мароз. Што гэта — Дзюбок, даўні цётчын знаёмы, які зайшоў яе праведаць.

...Дарэчы, таму самаму Дзюбку належаў адмысловы спосаб укарочвання адзення, які не без поспеху можна прымяняць і зараз. Тую ж світку, напрыклад, дзед клаў на калодку і сякерай адсякаў лішняе — ад рукавоў, ад полаў... Пакуль не дамагаўся патрэбнай даўжыні. І проста гэта, і хутка, і грошай плаціць не трэба. Паспрабуйце.

**Яўген Шастакоў,**
*г. Гомель.*

## ГЛУХІ НЕ ПАЧУЕ...

Дзед Міхась — чалавек паважаны. Ён у свой час не цураўся ніякай работы ні ў калгасе, ні дома, ва ўсім выручаў і сваіх вяскоўцаў. Гора навучыла яго спраўна валодаць касой і плугам, віламі і рыдлёўкай, пілой і сякерай, упраўляцца з конямі. Але ж гады такі ўзялі сваё, аўдавеў гэты чалавек, састарэў: нават у цяпло цяпер ходзіць у цёплых бурках ды шапцы-аблавушцы, дрэнна бачыць, моцна недачувае, але ж вельмі любіць пагутарыць з людзьмі.

Дык вось, аднойчы летнім надвячоркам сядзіць ён на лаўцы. Міма сунецца нейкі цуд, але не ў пер'ях — у парваных джынсах, размаляванай майцы. Па-панібрацку так кажа:

— Здароў быў, дзед! Як пажываеш?

— Ды дажываю, сынок, дажываю, — адказвае стары. — У дачкі сваёй... А ты чый жа будзеш? Нешта не пазнаю.

— Ды Лёнька я, Саўкаў праўнук.

— О-о, дзеда твайго я добра ведаў... Разам з ім па дзеўках некалі шасталі. І ў вайну партызанілі... А сам ты дзе жывеш?

— У горадзе.

— Небагатае, відаць, жыццё там, калі ты ў госці ў парваных портках прыехаў? Іх жа не залатаць ужо — гэтак знасіліся... Трэба новыя купляць. А скажы, які мастак табе грудзі размаляваў? Бач — над сэрцам нейкі мужчына... У берэце.

— Дык гэта ж тату... — хацеў патлумачыць Лёнька.

— Не-не, — заматаў галавою дзед. — Тату твайго я добра памятаю. Ён на гэтага мужыка зусім не падобны. Схібіў мастак.

— Гэта Чэ Гевара.

— «Чо гавару?», «Чо гавару?», — кінуўся ў крыўду стары, — тое, што чуеш: не падобны гэты мужык на тату твайго. І ты сам на яго не падобны. Вось скажы, хто цябе так падстрыг — толькі грэбень зверху пакінуў?

— Ды цяпер, дзед, мода такая: і на парваныя порткі, і на тату, і на стрыжку. Гэты, як ты кажаш, грэбень, «іракез» называецца. Панк я, разумееш?

— Не, брат, не залівай. Гэта ў Польшчы што ні мужык — то пан. А ў нас яшчэ з рэвалюцыі ні паноў, ні панкоў, ні падпанкаў. Уся твая радня з зямліцы кармілася. А ты, бач, у горадзе трохі пражыў і ўжо нейкі пан... Панок — без парток... З бутэлькай ходзіш. Відаць, скаромным пакармілі, калі смага сушыць?

— Не, дзед, у бутэльцы піва, для тонусу. Чытай во (хлопец павярнуў бутэльку этыкеткай да дзеда): «Баброў».



— Чуў я, чуў пра гэта, — узрадаваўся стары, — адзін з гарадскіх казаў, што бабровы струмень патэнцыял уздымае... Ці як ты сказаў — тонус?

— Паспрабуй, калі хочаш, — прапанаваў Лёнька.

— Не, брат. Мне падымаць нічога не трэба. Я абыдуся. А ты глыні. Да клуба, відаць, кіруеш?

— Так, да «цёлак» іду — патусуюся.

— Кажаш, да цётак?... Сходзі, брат, сходзі... Там і праўда пачастуешся... Цёткі, нябось, узрадуюцца, што пляменнічак прыехаў. А я крыху пасяджу яшчэ... Можа, яшчэ з кім пагутару.

**Я. Звярынскі,**
*г. Узда.*

## ЯБЛЫКІ З ШЭКСПІРАЎСКАГА САДУ

Скажаце, што гэта неверагодна? Дзе тыя часы, маўляў, дзе яго мясціны, а дзе Беларусь? Я раскажу.

Пры камуністах мы, савецкія людзі, і сапраўды па замежжах не ездзілі. За рэдкім выключэннем. Сталін лічыў, што нашаму чалавеку няма там чаго рабіць і на што глядзець.

Але ж многім вельмі хацелася, а як мне — дык яшчэ і пашчасціла, бо пабываў я не толькі ў рэспубліках былога Савецкага Саюза, але і ў краінах так званай народнай дэмакратыі. Нават больш за тое — з групай турыстаў трапіў у Англію.

Тут, напэўна, трэба нагадаць, што ў савецкія часы быў строгі падзел, было меркаванне так званае, што ў краінах народнай дэмакратыі жывуць нашы сябры і браты (хай не такія блізкія, як у саюзных рэспубліках), а вось там, дзе правіць капітал, — ну вядома ж, ворагі, з якімі лепей не знацца.

Вось і не зналіся мы, не ездзілі, ці бывалі гады ў рады... Ва ўсякім разе аб тым, што ў Лондан прыбылі мы, турысты з Беларусі, паведамляла англійскае радыё. У праграме ранішніх навін нават перадавалі, дзе мы плануем пабываць і што пабачыць.

...У першую чаргу нас, вядома ж, цікавіў Шэкспір: горад Стратфард-на-Эйване, дзе ён нарадзіўся, царква, ля якой пахаваны.

Дык вось. Туды, у мемарыяльны музей-сядзібу, мы прыехалі чамусьці зарана — яшчэ да адкрыцця — і, так бы мовіць, адны: кіраўніца групы трохі спазнялася.

Мы чакалі яе. А заадно — пазіралі навокал, любаваліся ўсім, што бачылі: вуліцай, будынкамі, старым вялізным садам і, вядома ж, яблыкамі. Іх было неверагодна шмат — і на дрэвах, і пад дрэвамі... Імі была засыпана ўся трава, усе сцежкі...

Карацей, адзін з нас не стрымаўся — нагнуўся, падняў яблык, пацягнуў у рот. Гледзячы на яго, тое ж зрабіў другі турыст, потым трэці... А там і ўся група стала хрумстаць сакаўныя плады і, можна сказаць, святкаваць, бо гэта ж былі не проста яблыкі, а замежныя, англійскія, да таго ж — шэкспіраўскія, смачныя, бясплатныя... (Вартаўніка ў тым садзе дакладна не было.)

А вось кіраўніца наша хутка з'явілася. І...

Што тут пачалося — не перадаць! Жанчына не сказаць каб гучна (нельга ж прыцягваць увагу), але вельмі злосна ўзялася нас адчытваць:

— Ды як вам не сорамна? Як вы пасмелі паквапіцца, замахнуцца на чужое, на святое? Тут, у гэтакім месцы!

Нам было вельмі няёмка: мы хацелі праваліцца скрозь зямлю. Але кіраўніца (яна, дарэчы, не з нашых, не з беларусак была, масквічка нейкая) гэтага не заўважала, яна «выхоўвала» нас далей. Казала, што тут усюды прыватная ўласнасць, што вось зараз можа з'явіцца паліцыя... І што гэта палова бяды. А ўся яна будзе, калі раптам высветліцца, што работнікі музея самі... нарассыпалі гэтых яблыкаў. І не для таго, каб зрабіць прыгожа, а для... правакацыі. Для таго, каб потым запрасіць нейкага фатографа, зняць нас на плёнку, а заўтра ва ўсіх газетах расказаць і паказаць, як галодныя савецкія турысты ядуць чужыя яблыкі...

Вось тут нам стала зусім дрэнна. Мы, свядомыя, сумленныя людзі (у групе былі кіраўнікі прадпрыемстваў, работнікі Акадэміі навук, артысты, педагогі), адчувалі сябе апошнімі злачынцамі, якіх толькі што злавілі за руку, якія зганьбілі не толькі сваю краіну, але і ўвесь Савецкі Саюз і якіх больш ніколі не выпусцяць за межы Беларусі...

Факт, што ліха мы хапілі спаўна: хваляваліся, перажывалі. Але ж, дзякаваць богу, марна: пранесла! І ўсё атрымалася зусім не так. Ва ўсякім разе я праз некалькі гадоў пасля паездкі ў Англію ўжо апынуўся ў Егіпце. Каб паказаць гэту краіну, нас, турыстаў, каталі на розных відах транспарту: на цягніку, на аўтобусе, на параходзе, нават на вярблюдах...

А ў самым канцы падарожжа мы ўжо адпачывалі — у Александрыі, на беразе Ніла. Жылі ў гатэлі, які называўся «Палесціна» і які (закон бутэрброда ў дзеянні) таксама быў размешчаны ў садзе. Праўда, з галінак дрэў там звісалі не шэкспіраўскія яблыкі, не нашы грушы ці слівы, а вялікія спелыя апельсіны. Мы ў той час іх у вочы не бачылі — хіба на Новы год, а там яны валяліся пад нагамі. Падымай, здавалася, з зямлі, зрывай з дрэва, еш — прычым, колькі хочаш, бо ніякай варты няма...

Але ж я, ужо навучаны гісторыяй з яблыкамі, на гэтую прынаду не клюнуў, іншым таксама не раіў, бо ведаў, што за намі, турыстамі, усюды сочаць.

...Так што яблыкі з шэкспіраўскіх яблынь я зрываў і каштаваў. А вось смаку апельсінаў, сарваных з дрэва, на жаль, не ведаю.

**П. Сачыўка,**
*в. Цырын, Карэліцкі р-н.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**
*dounar@zviazda.by*

■ Неасабісты суб'ектыў

# КРЭДЫТ ДАВЕРУ



## Пра неаплачаную кватэру, дармавую бульбу і пачуццё сораму

РЫГОР Фёдаравіч прыйшоў у рэдакцыю шукаць справядлівасці. Скардзіўся не на чыноўнікаў, не на нейкую арганізацыю, як у нас бывае звычайна. Дый насамрэч і не скардзіўся — хутчэй здзіўляўся. Расказваючы, часам спыняўся на паўслове, бы сам сябе перапытваў: няўжо хтосьці так можа? Адчуваў няёмкасць, нібы не яго крыўдзіцель паступіў з ім па-свінску, а ён сам у нечым перад некім правініўся.

Гісторыя гэтага васьмідзесяцісямігадовага інтэлігентнага і абсалютна ў цвёрдай памяці дзядулі вельмі нават звычайная па нашым часе. Дачка развялася з мужам, які піў і гуляў, і вымушана была выплачваць яму немалую кампенсацыю за частку нядаўна пабудаванай кватэры, каб жылплошча, прыдбаная падчас сумеснага жыцця, засталася ёй. Бацькі з невялікай пенсіяй дапамагалі як маглі, і тут вельмі дарэчы прыйшлася невялікая аднапакаёвая «хрушчоўка» ў цэнтры, якая Рыгору Фёдаравічу засталася ў спадчыну пасля смерці сястры. Яе пачалі здаваць, і ўсё ішло добра, пакуль у кватэру не пасяліліся новыя кватаранты — бацька і сын з невялікага гарадка на Гродзеншчыне. Гаспадару яны здаліся прыстойнымі людзьмі, ён нават скінуў ім дзесяць долараў аплаты. Як і палажана, заключылі ў разлікова-даведачным цэнтры дагавор найму жылога памяшкання, дзядуля сумленна аплаціў падатак за будучы прыбытак ад кватарантаў. Авансу на пачатку месяца ён з іх не ўзяў, бо асабліва не хваляваўся: у дагаворы чорным па белым было напісана, што плаціць будуць 25-га чысла па 250 рублёў (новымі) у месяц.

ВЫ ўжо здагадаліся, пэўна, чым усё скончылася? Кватаранты пражылі два месяцы, не заплацілі гаспадару ні капейкі, з'ехалі ў невядомым напрамку, нават не паведаміўшы, мала таго — звезлі з сабой ключы ад кватэры. Рыгор Фёдаравіч стаў званіць на нумар, які пакінулі яму для сувязі, — «апарат абанента выключаны». Ён у міліцыю з заявай — атрымаў цалкам лагічны адказ: справа ў плоскасці не крымінальнай, а грамадзянскай, падавайце на крыўдзіцеля, які не выканаў умовы дагавора, у суд. Грошай на судовыя выдаткі ў дзядулі няма, ён і так страціў немалую суму (калі палічыць неатрыманыя за кватэру ды яшчэ падатак, які заплаціў. А цяпер і замок давядзецца мяняць). І тады ён прыйшоў у рэдакцыю не са скаргай — са здзіўленнем: як жа гэта хтосьці мог парушыць заключаны па ўсіх правілах дагавор? А яшчэ Фёдар Рыгоравіч спадзяваўся, што ў нас у горадзе, адкуль яго крыўдзіцелі, ёсць свой карэспандэнт, які знойдзе іх там і паўшчувае: што ж вы, маўляў, парасяты гэткія, старога чалавека крыўдзіце?

Карэспандэнта ў нас у тым райцэнтры не аказалася, але я паслала пісьмо ў тамтэйшы аддзел міліцыі з просьбай дапамагчы. Хай бы знайшоў участковы таго дзецюка (пашпартныя даныя былі ў дагаворы, ім падпісаным) ды пагаварыў па-чалавечы. Больш, на жаль, зрабіць нічога нельга: складу злачынства няма, на махлярства не цягне...

СПАДЗЕЮЧЫСЯ, што ўсё ж удасца вярнуць Фёдару Рыгоравічу веру ў людзей і справядлівасць, я вось пра што думаю. Звычайнае бытавое сумленне (скарыстаўся — вярні, купіў — заплаці, пазычыў — аддай, паабяцаў — зрабі) — адна з вызначальных рыс нашага нацыянальнага характару. Такія паводзіны лічыліся нормай, а да тых, хто гэтыя нормы парушаў, ставіліся як да прыдуркаватага, — з пагардай і спачуваннем адначасова. Беларусаў ніхто ніколі не назваў хітрымі, падманшчыкамі, прайдзісветамі, і гэтым можна ганарыцца, бо словы «людскасць, чалавечнасць» маюць свае дакладныя адпаведнікі далёка не ва ўсіх нават еўрапейскіх мовах.

Што ж тады за збой адбыўся ў нашай генетычнай памяці? Калі памяняліся прыярытэты? Чаму ў тым, што хтосьці кагосьці абдурыў (пажыў у кватэры і з'ехаў не заплаціўшы, збыў з рук сапсаваную рэч, прадаў дорага тое, што сам купіў за бясцэнак), мы ўсё часцей не толькі не бачым граху ці ўчынку, пра які нават думаць сорамна, — мы з прыхаваным гонарам хвалімся гэтым сябрам і знаёмым, называючы гэта на блатным жаргоне «развесці лоха»? Можа, такі стыль паводзін дыктуе нам няпросты час, у які жывём? Людзі адзін аднаму цяпер чужыя, дый грошай заўжды не хапае. Але ж прадзеды, нават калі пяклі хлеб напалову з мякінай, ніколі так не рабілі. Маральная планка была тады вышэйшая ці Божага гневу баяліся?

НА інтэрнэт-барахолцы знаёмая нядаўна малому хадунок купляла. Прывезла яго, акуратна складзены ў пакет, маладая прыветлівая кабета. Яны яшчэ пагаварылі міла пра дзяцей... Адкрыўшы ўвечары пакупку, знаёмая заўважыла, што не хапае дэталяў, без іх той хадунок каб хацеў — не збярэш. Стала тэлефанаваць былой гаспадыні: можа, забылася тыя дэталі пакласці — усякае ж бывае. А тая так спакойна адказвае: а іх і не было, маўляў. На абсалютна лагічнае ў такім выпадку патрабаванне забраць сапсаваны тавар і вярнуць грошы зноў жа спакойна адказала: «У мяне іх не так многа, каб вам вяртаць...» Выраз твару ў маёй знаёмай, калі яна расказвала пра гэты выпадак, быў вельмі падобны на той, што быў на твары Рыгора Фёдаравіча, калі ён прыходзіў у рэдакцыю: здзіўленне і нібы вінаватасці ў тым, што чалавек мог так паступіць. Мы ўсё яшчэ верым людзям і лічым, што так павінна быць. Але наколькі гэтага крэдыту даверу ў нас хопіць?

Днямі мне прыйшло пісьмо з Ляхавіцкага раёна. Чытачка па імені Вольга рашыла чамусьці паспавядацца. На цэлую старонку напісала, як абдурыла дзеда, якога сустрэла на кірмашы ў Баранавічах. Стары прадаваў там бульбу, яна ўгаварыла яго прадаць мех у доўг. Дзед згадзіўся. Ёй спадабалася, дык узяла яшчэ мех, пасля яшчэ. Мала таго — яна яшчэ і грошы ў старога пазычыла з абяцаннем аддаць. Цяпер вось села, падлічыла: доўгу разам з тым, што за бульбу павінна, «націкала» сто трыццаць шэсць рублёў. Дзесяць з іх неяк вярнула. А астатнія... «Я яму званю кожны дзень і абяцаю, што аддам. А аддаваць не хочацца, бо шкада...» І пытанне, якое павісла касым радком на пажаўцелым аркушы са старога школьнага сшытка: «Як вы думаеце, ці ўплывае падман на жыццё чалавека?»

Я асабіста думаю, што ўплывае. «І будзе кожнаму па справах яго...» Пакажыце мне чалавека, які ўласным прыкладам гэта аспрэчыць...

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.** *alena@zviazda.by*

## ИЗВЕЩЕНИЕ
### о проведении 26 января 2017 года торгов по продаже конфискованного имущества

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (наименование, местонахождение, характеристики продаваемого имущества)** | Единый объект недвижимого имущества в составе недвижимого улучшения клуба №610/С-24911 (общ. пл. 918,8 кв. м), условный земельный участок пл. 0,1159 га, расположенный по адресу: г. Борисов, ул. Генерала Толстикова, 2 |
| **Начальная цена** | 66 492,05 бел. руб. (664 920 500 бел. руб. образца 2000 года) |
| **Сумма задатка** | 6 600,00 бел. рублей (66 000 000 бел. руб. образца 2000 года) |
| **Организатор аукциона** | Коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, (017) 327-05-62 |

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 19.02.2016 № 63, и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются резиденты и нерезиденты (за исключением продажи земельных участков) Республики Беларусь, своевременно внесшие задаток и подписавшие соглашение с организатором торгов о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие в установленный срок организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, определенной организатором аукциона); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, определенной организатором аукциона); копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); документ, подтверждающий внесение суммы задатка с отметкой банка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

*Задаток перечисляется на расчетный счет №3012104971019 в региональной дирекции №700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369; получатель – коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583. Сумма задатка для участия в аукционе должна быть внесена в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.*

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем аукциона, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона. Информация о размере затрат доводится до сведения участников перед началом аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение 20 рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Аукцион проводится **26 января 2017 года в 11.30** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 26.12.2016 по 23.01.2017 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок: (017) 327-40-22, (017) 327-48-36 – коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости».**

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»** УНП 190055182
**сообщает, что дата проведения повторного открытого аукциона, извещение о котором опубликовано в газете «Звязда» 10.12.2016, переносится на 11.01.2017 в 14.00. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 09.01.2017 до 11.00.**
Полная информация на сайте **ino.by** или по телефонам:
**8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52.**

**Считать недействительными утерянные ЗАО «СК «Белросстрах» бланки квитанций и страховых полисов:**
- «Квитанция о приеме наличных денежных средств (страховых взносов)» ф. 1-СУ серия СВ №№ 0541552, 0198086, 0198087, 0193131, 0195875 и серия КС № 3477398;
- полисы «Добровольное страхование от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу» ф. 2РН, 2РП серия БИ №№ 1584805, 1584810, 1460778, 1460790, 1460794, 1561778, 1561781, 1561804, 1591488, 1591537, 1555271, 1555273;
- полис «Добровольное страхование от несчастных случаев» ф. 2РН, 2РП серия НС №№ 0007522-0007524, 0037344;
- полисы «Добровольное страхование имущества физических лиц; Добровольное страхование гражданской ответственности владельцев квартир» ф. 2РН, 2РП серия БИ №№ 0027378, 0036548, 0036549.

УНП 100782388

## ИЗВЕЩЕНИЕ
### о проведении 26 января 2017 года торгов по продаже конфискованного имущества

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (наименование, местонахождение, характеристики, продаваемого имущества)** | Изолированное помещение № 36 с инвентарным номером 610/D-10646, расположенное по адресу: г. Борисов, ул. Демина, 39 (общая площадь: 7,1 кв.м; наименование: изолированное помещение № 36 торгового ряда № 13) |
| **Начальная цена** | 11 736,54 бел. руб. (117 365 400 бел. руб. образца 2000 года) |
| **Сумма задатка** | 1 000 бел. руб. (10 000 000 бел. руб. образца 2000 года) |
| **Организатор аукциона** | Коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», 220030 г. Минск, ул. К. Маркса, 39, ком. 10 |

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 19.02.2016 № 63, и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются резиденты и нерезиденты Республики Беларусь, своевременно внесшие задаток и подписавшие соглашение с организатором торгов о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие в установленный срок организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, определенной организатором аукциона); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, определенной организатором аукциона); копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); документ, подтверждающий внесение суммы задатка с отметкой банка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

